Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

СТУДЗЕНЬ 24 1934 г. СЕРАДА № 19 (4852)

Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, алучайцесь!

Пастанова XII з'езда КП(б)У

ХАРКАЎ, 21. (ТАСС). XII з'езд КП(б)У пастанавіў: З прычыны ўмацавання асноўных прамысловых раёнаў Украіны, стварэнне абласцей, палягчаючых кіраўніцтва гэтымі прамысловымі раёнамі Украіны (Данбас, Харкаў, Днепрапятроўск), маючы на ўвазе неабходнасць набліжэння ўрада Украіны і цэнтральнага партыйнага і совецкага апарата к важнейшым сельска-гаспадарчым раёнам, якімі з'яўляюцца раёны, размешчаныя на правабярэжжы Украіны, а таксама для далейшага і хутчэйшага развіцця нацыянальна-культурнага будаўніцтва і большэвіцкай украінізацыі на базе індустрыялізацыі і калектывізацыі — перанесці сталіцу Украіны ў гор. Кіеў, які з'яўляецца яе натуральным геаграфічным цэнтрам.

Тэрмін пераезду—восень 1934 года.

Пастанова Усеукраінскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта

У сувязі з рашэннем XII з'езда КП(б)У Усеукраінскі Цэнтральны Выканаўчы Камітэт пастанаўляе: Перанесці сталіцу Украінскай Савецкай Сацыялістычнай Совецкай Рэспублікі ў горад Кіеў.

Тэрмін пераезду ўрада ў горад Кіеў устанавіць — восень 1934 года.

СТАРШЫНЯ УСЕУКРАІНСКАГА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА Г. ПЕТРОЎСКІ.

САКРАТАР УСЕУКРАІНСКАГА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА Ю. ВАЙЦЭХОЎСКІ.

Харкаў, 21 студзеня 1934 г.

ЗАКРЫУСЯ XV З'ЕЗД КП(б)Б

ПАБОЛЬШЭВІЦКУ ЗА РАБОТУ!

XV з'езд КП(б)Б, які толькі што закончыў сваю работу, падвёў вынікі велізарнейшай работы, прароблены за апошнія два гады, і намеціў новыя задачы, яшчэ больш складаныя, яшчэ больш грандыёзныя.

XV з'езд будзе займаць выдатнае месца ў гісторыі КП(б)Б, бо ён знамянуе сабой важнейшы этап у барацьбе за большэвізацыю партыйных арганізацый Беларусі. XV з'езд з'яўляўся дэманстрацыяй маналітнасці і згуртаванасці КП(б)Б вакол ленінскага ЦК ВКП(б) і правадыра партыі тав. СТАЛІНА. КП(б)Б яшчэ не ведала такога адзінства волі, такой загартаванасці і ідэйнай згуртаванасці, як зараз. КП(б)Б стала сапраўды непахісвай большэвіцкай когортай, напёршы рашучы ўдар па астатках групоўшчыны, сямейнасці і месніцтва.

Гістарычнае значэнне XV з'езда КП(б)Б заключаецца ў тым, што ён супаў з 15-годдзем БССР і 15-годдзем з дня 1-га з'езда КП(б)Б. З'езд падвёў вынікі барацьбы прапоўных Беларусі пад кіраўніцтвам КП(б)Б за гэтыя 15 год. Вынікі гэтай барацьбы, шырока асветленыя ў дакладзе тав. ШАРАНГОВІЧА, ёсць трыумф ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Пад кіраўніцтвам ЦК ВКП(б), КП(б)Б на чале з тав. Гікало за час паміж XIV і XV з'ездамі смела і рашуча перамагала і выпраўляла дапушчаныя памылкі, вядучы бязлітасную барацьбу са славеснадэкларацыйнымі адносінамі комуністаў да правядзення генеральнай лініі партыі, з гніла-ліберальнымі і перараджэнскімі элементамі, якія прыкрываюцца фальшыва-нацыянальным сцягам, з буржуазна-нацыяналістычнымі і кулацкімі тэндэнцыямі ў паасобных звеннях партыйных і совецкіх арганізацый.

Пад знакам большэвіцкай самакрытыкі і высокай партыйнай прынцыповасці, пад знакам барацьбы з наяўнымі недахопамі праходзіў XV з'езд. Яшчэ ва ўступным слове пры адкрыцці з'езда тав. ГІКАЛО ўказаў, што «мы маем усе даныя для таго, каб канчаткова ліквідаваць якое-б там ні было адставанне на ўсіх участках практычнай работы».

Як у спрэчках, так і ў сваіх пастановах з'езд з усёй большэвіцкай праматой указаў на асобныя прарывы і недахопы. З'езд прызнаў зусім нездавальняючай работу прамысловасці. З'езд адзначыў, што ў кіраўніцтве прамысловасцю з боку наркаматаў і трэстаў яшчэ не ліквідаваны фармалізм, бюракратызм і канцылярщчына, што кіраўніцтва прамысловасцю яшчэ не перабудавана ў адпаведнасці з рашэннямі студзеньскага пленума ЦК ВКП(б) і ліпеньскага пленума ЦК КП(б)Б. З'езд адзначыў рад істотных недахопаў і ў кіраўніцтве сельскай гаспадаркай і ў галіне нацыянальна - культурнага будаўніцтва.

Канкрэтнасць, дзелавітасць, рашучая крытыка недахопаў, большэвіцкая прынцыповасць — такі стыль работы КП(б)Б за апошні перыяд, такі быў стыль работы XV з'езда. XV з'езд у гэтых адносінах з'яўляецца мацнейшай зарадкай для ўсіх партыйных арганізацый КП(б)Б, з'яўляецца ўзорам і прыкладам, на якім будуць вучыцца большэвікі Беларусі. Недарма тав. Гікало ў сваім уступным слове заклёўніў ад імя з'езда партканферэнцыю большэвікоў Масквы, што «ўзоры сапраўды большэвіцкай аператыўнай, канкрэтнай работы, ажыццяўляемай ва ўсёй практычнай і палітычнай дзейнасці Маскоўскай арганізацыі, пад кіраўніцтвам аднаго з лепшых, вярнейшых саратнікаў тав. СТАЛІНА — тав. КАГАНОВІЧА, узбройваюць большэвікоў Беларусі, натхняюць іх у іх складанай рабоце на мяжы капіталістычным светам, з'яўляюцца прыкладам адданейшай, самаахвярнай практычнай барацьбы і работы за справу партыі, за справу ЛЕНІНА, за справу СТАЛІНА».

XV з'езд КП(б)Б праходзіў напярэдадні XVII з'езда ВКП(б), які падвядзе вынікі пераможнай барацьбы рабочых і сялян пад кіраўніцтвам партыі, пад кіраўніцтвам СТАЛІНА за перамогу ленінскай палітыкі. За перыяд паміж XVI і XVII з'ездамі ВКП(б) Совецкі Саюз высунуўся ў першыя ряды самых перадавых у тэхніка-эканамічных адносінах краін, ператварыўся ў краіну, якая мае ўласную базу для поўнага завяршэння ў другой пяцігодцы тэхнічнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі. Як ніколі ўмацаваўся саюз рабочага класа з сялянствам, як ніколі ўзрасла і ўмацавалася кіруючая роля рабочага класа і нашай ленінскай партыі. СССР не ратварыўся ў краіну перадавой соцыялістычнай культуры, краіну росквіту навукоўай і тэхнічнай мыслі. СССР стаў рашаючым фактарам міжнароднага жыцця і палітыкі.

Гіганцкія сусветна-гістарычныя перамогі СССР асабліва рэльефна падкрэсліваюцца дасягненнямі нацыянальных рэспублік, у тым ліку і БССР. Даклад тав. ГІКАЛО аб рабоце ЦК, даклад тав. ШАРАНГОВІЧА аб 15-годдзі БССР і даклад тав. ГАЛАДЗЕДА аб калгасным і соўгасным будаўніцтве—усе яны былі дэманстрацыяй таржэства генеральнай лініі партыі, таржэства ленінскай нацыянальнай палітыкі.

КП(б)Б, кіруючыся ўказаннямі тав. СТАЛІНА аб тым, што для ажывання гаспадарчай і культурнай адсталасці нацыянальных рэспублік, апрача развіцця нацыянальных школ, мовы і т. д., неабходна дабіцца таго, каб у гэтых рэспубліках былі заснаваны вачагі прамысловасці,—забяспечыла пры шырокай дапамозе саюзнага пролетарыята развіццё прамысловасці БССР больш высокімі тэмпамі, чым сярэднія тэмпы росту прамысловасці па СССР. У рэзультаце выканання першай пяцігодкі прамысловая прадукцыя БССР вырасла на 418,8 проц. супроць 219 проц. росту прамысловай прадукцыі СССР. Удзельная вага прамысловасці БССР у прамысловасці ўсяго Совецкага Саюза павысілася з 1,92 проц. у 1928 г. да 2,51 проц. у 1932 г.

Пад кіраўніцтвам КП(б)Б БССР дабілася вялікіх дасягненняў і ў галіне сельскай гаспадаркі, у галіне большэвізацыі калгасаў. Калгаснікі Беларусі сталі на цвёрды шлях заможнага і культурнага жыцця. На аснове велізарных поспехаў соцыялістычнага будаўніцтва за гады першай пяцігодкі і першага года 2-й пяцігодкі, БССР ператварылася ў краіну перадавой культуры.

Усе гэтыя перамогі атрыманы ў жорсткай барацьбе з класавымі ворагамі і іх агентамі ўнутры партыі. КП(б)Б нанесла рашучы ўдар па вялікадзяржаўных шавіністах, па беларускаму нацыяналізму, які змыкаецца з імперыялістычнымі інтэрвентамі і які з'яўляецца цяперашнім галоўным небяспекай у сучасных умовах, па шавінізму другіх мастей. Спробы класава-варожых элементаў падарваць наша соцыялістычнае будаўніцтва, адарваць БССР ад Совецкага Саюза пацярпелі крах. БССР была, ёсць і будзе неадлучнай часткай вялікага Совецкага Саюза і яго балвым фарпостам на стыку з капіталістычным Захадам. КП(б)Б была, ёсць і будзе неразрыўнай часткай ВКП(б), маналітным атрадам партыі ЛЕНІНА, вернай апорай ленінскага ЦК ВКП(б) і правадыра партыі тав. СТАЛІНА.

XV з'езд, выходзячы з тэзісаў к XVII з'езду ВКП(б), паставіў перад КП(б)Б вялікія задачы. Выраўнанне гэтых задач патрабуе карэннай перабудовы работы партыйных арганізацый, яшчэ большага ўмацавання кіруючай ролі нашай партыі, яшчэ большай адказнасці кожнага комуніста за даручаную яму справу, яшчэ большай рэволюцыйнай пільнасці і большэвіцкай непрымірымасці ў барацьбе з класавым ворагам і яго агентурай.

Упэўнена і радасна глядзіць кожны рабочы і калгаснік на сваю будучыню. Гэтым тлумачыцца той творчы ўздым і энтузіязм, якія з кожным днём вырастаюць з велізарнейшай сілай. Задача партыйных арганізацый—глыбокай арганізатарскай і палітычнай работай замацоўваць гэты ўздым, і павесці масы на гераічную барацьбу за ажыццяўленне пастаноў XV з'езда КП(б)Б і XVII з'езда ВКП(б), на ажыццяўленне задач пабудовы бясклассавага соцыялістычнага грамадства.

XV з'езд КП(б)Б скончыўся. Па большэвіцку—за работу!

ВЫБАРЫ КІРУЮЧЫХ ОРГАНАЎ

22 студзеня, у 6 гадзін вечара, скончыў сваю работу XV з'езд КП(б)Б.

З'ездам выбран Цэнтральны Камітэт КП(б)Б ў складзе 103 членаў і 43 кандыдатаў, а таксама рэвізійная камісія ў складзе 11 чалавек.

Членамі ЦК КП(б)Б выбраны т. т.:

1. АМБРАЖУНАС,
2. БЕНЕК,
3. БРАГІНСКІ,
4. БАЛЦІН,
5. БАСКІН,
6. БАНДАРЧЫК,
7. БАНГАЙЦІС,
8. БУРАВА,
9. БАРДЗІЁНАЎ,
10. БАЛЫЧЭНКА,
11. ВАЛОДЗЬКА,
12. ВАСІЛЬКОЎСКІ,
13. ВАСЕРМАН,
14. ВАЛКОВІЧ,
15. ВАЛКІН,
16. ВАЙМАН,
17. ВАЙНЕР,
18. ГІКАЛО,
19. ГАЛАДЗЕД,
20. ГОТФРЫД,
21. ГЕРЦОВІЧ,
22. ГОРЫН,
23. ГАЛЕНДА
24. ГУРЭВІЧ,
25. ГАРУНОВІЧ (работніца ф-кі «Окцябр»),
26. ГАЛЯТОЎСКІ,
27. ГРЫБАЎ,
28. ГАРНАСТАЕЎ,
29. ДУБІНА,
30. ДАНЕНКА,
31. ДАМБРОЎСКІ,
32. ДОМБАЛЬ,
33. ДОСІН,
34. ДАНЦЫГЕР,
35. ДЫНДЗІН,
36. ДЭЙЧ,
37. ЖАБРОЎСКІ,
38. ЖУКОВІЧ,
39. ЖУКАЎ,
40. ЖУРАЎЛЁЎ,
41. ЖОЛУДАЎ,
42. ЖЫЛЬЦОЎ,
43. ЗАКОЎСКІ,
44. ЗЛОТКІН,
45. КАРТУКОЎ,
46. КОНІК,
47. ЗІНОЎЕЎ,
48. КАВАЛЬЧУК,
49. КУЗЬМІН,
50. КУДЗЕЛЬКА,
51. КРАЦЭР,
52. КЛІМЧУК,
53. КІШТЫМАЎ,
54. КІРЫЛАЎ,
55. КАРНАЧОЎ,
56. КАБАЧЭЎСКІ,
57. КІВЕРЦАЎ,
58. ЛЫЧОЎ,
59. ЛЕЎКОЎ,
60. ЛАСТОЎСКІ,
61. ЛІСКОВІЧ,
62. ЛЕВІН,
63. ЛЮБОЎЦЭЎ,
64. ЛУКІН,
65. МІЛЛЕР,
66. МАНЮК,
67. МІЛЬТО,
68. МАРУШКІН,
69. ІВАНОЎ,
70. НІЗОЎЦАЎ,
71. ПАРФЕНОВІЧ,
72. ПЫЖЫКАЎ,
73. ПЛЕТНЁЎ,
74. РЫСКІН,
75. РОЗІН,
76. РУСАНАЎ,
77. РЭВІНСКІ,
78. РЫЖЫКАЎ,
79. РАЗУМАЎ,
80. РАЗАНОВА,
81. РУТЭНБЕРГ,
82. РАТНЕК,
83. СМІРНОЎ,
84. СААК'ЯН,
85. СОСКІН,
86. СНЕДЗЕ,
87. СУХАНАВА,
88. СУПРУН,
89. СУРТА,
90. ТУРЛАЙ,
91. ЦІМАШЭНКА,
92. ТАРУЦІНСКІ,
93. УБАРЭВІЧ,
94. ХАЦКЕВІЧ,
95. ХАДАСЕВІЧ,
96. ФІШБЕЙН,
97. ЧАРВЯКОЎ,
98. ЧАРНУШЭВІЧ,
99. ЧАРНЫШОЎ,
100. ШАРАНГОВІЧ,
101. ШАФАРЭНКА,
102. ШАРАЎ,
103. ШВАЙКА.

Кандыдатамі ў члены ЦК выбраны т. т.:

1. КАНАВАЛАЎ,
2. ПАСЮКЕВІЧ,
3. ТАМАРКІН,
4. БОЙКА,
5. НОВІКАЎ,
6. БУРАЧЭЎСКІ,
7. КАМАРОЎ,
8. МАЙСЕЕЎ,
9. РЭЗНІКАЎ,
10. РАМАНЧУК,
11. РАДЗІН,
12. ПЛЕШАКОЎ,
13. ПЛАЎНІК,
14. ПІЛІПЁНАК,
15. ПАДАРЫН,
16. БАШМАЧНІКАЎ,
17. НЕФЕДАЎ,
18. ПАССЭ,
19. МАКЕЕЎ,
20. МІРОНАЎ,
21. ЖУКАЎ,
22. ЗАЛПЕТЭР,
23. ДЗЕНІСКЕВІЧ,
24. БРАЎКОВІЧ,
25. ЛЕНЦНЕР,
26. ЛІХЕРЗАК,
27. ЛУПЕКІН,
28. ДРАКОХРУСТ,
29. ЮНГ,
30. ЧОРНЫ,
31. ХЕЙФЕЦ,
32. ШАБАЛДЗІН,
33. АЙВАЗАЎ,
34. АВЕРЫН,
35. КЛІМКОВІЧ,
36. ЛОБЗАРЭЎ,
37. ГАЙДУКЕВІЧ,
38. БЕЛЕНЬКІ,
39. АЎГУСТАЙЦІС,
40. ВАЙНОВІЧ,
41. МАЛАШОНАК,
42. ЦІМОШКІНА,
43. КОПАЧ.

У склад рэвізійнай камісіі выбраны т. т.:

1. СТАРАВОЙТАЎ,
2. КУДЗЕЛЬСКІ,
3. КУЗЬМІН,
4. ПРУСАКОВА,
5. СВЕРДЛОВА,
6. СМІРНОЎ,
7. САКАЛЕНКА,
8. СЫЧОЎ,
9. ФЛЕКСЕР,
10. БАГДАНАЎ,
11. БУРЫНСОН,

РАШЭННЕ З'ЕЗДА ПА ДАКЛАДУ ЦК І ЦКК

XV з'езд КП(б)Б даў наступную ацэнку работы ЦК і ЦКК КП(б)Б:

1. XV з'езд КП(б)Б, заслухаўшы даклад тав. ГІКАЛО аб рабоце ЦК КП(б)Б за перыяд з XIV па XV з'езд КП(б)Б, прызнае палітычную лінію ЦК КП(б)Б за справаздачны перыяд правільнай і практычную работу ЦК апраўдальняючай.

2. XV з'езд КП(б)Б, заслухаўшы даклад тав. ЛЫЧОВА аб рабоце ЦКК КП(б)Б за перыяд з XIV па XV з'езд, адабрае работу ЦКК КП(б)Б.

XV з'езд зацвердзіў справаздачу рэвізійнай камісіі.

ДЭЛЕГАЦЫЯ НА XVII З'ЕЗД ВКП(б)

Дэлегатамі на XVII з'езд ВКП(б) выбрана з рашаючым голасам 30 чал. і 8 чал. з дарадчым.

З рашаючым голасам выбраны т. т.

1. ГІКАЛО,
2. АНЦІПАЎ,
3. САХАРАВА,
4. ШАРАНГОВІЧ,
5. ЖАБРОЎСКІ,
6. ЛЫЧОЎ,
7. ГАЛАДЗЕД,
8. ЧАРВЯКОЎ,
9. КАРТУКОЎ,
10. РЫСКІН,
11. РАТНЕК,
12. БАНГАЙЦІС,
13. ШАФАРЭНКА,
14. ЖУРАЎЛЁЎ,
15. КАВАЛЬЧУК,
16. ЗАКОЎСКІ,
17. ТУРЛАЙ,
18. БЕНЕК,
19. ЧАРНЫШОЎ,
20. БРУК,
21. ДОСІН,
22. РУТЭНБЕРГ,
23. КІРЫЛАЎ,
24. СМІРНОЎ,
25. АЛКСНІС,
26. ПАДАРЫН,
27. ВАЙНЕР,
28. ІВАНОЎ,
29. ДРАКОХРУСТ,
30. БУРАВА.

З дарадчым голасам выбраны т. т.

1. ВАСІЛЬКОЎСКІ,
2. КОНІК,
3. БРАГІНСКІ,
4. ВАЛКІН,
5. ШЭВАЛДЗІН,
6. ГЕРЦОВІЧ,
7. ТАРУЦІНСКІ,
8. ГОРЫН.

ПЛЕНУМ ЦК КП(б)Б НОВАГА СКЛАДУ

22 студзеня 1934 года адбылося першае пасяджэнне пленума ЦК КП(б)Б, выбранага XV з'ездам КП(б)Б.

Пленум выбраў Бюро ЦК КП(б)Б у складзе 16 членаў і 7 кандыдатаў

Членамі бюро ЦК КП(б)Б выбраны т. т.:

1. ГІКАЛО,
2. ШАРАНГОВІЧ,
3. ГАЛАДЗЕД,
4. ЛЫЧОЎ,
5. РЫСКІН,
6. ЖАБРОЎСКІ,
7. ЗАКОЎСКІ,
8. УБАРЭВІЧ,
9. СМІРНОЎ,
10. РАТНЕК,
11. КАВАЛЬЧУК,
12. КАРТУКОЎ,
13. ЧАРВЯКОЎ,
14. БЕНЕК,
15. ШАФАРЭНКА,
16. ЧАРНУШЭВІЧ.

Кандыдатамі ў члены бюро ЦК выбраны т. т.:

1. ЖУРАЎЛЁЎ,
2. ГЕРЦОВІЧ,
3. ГОРЫН,
4. КОНІК,
5. СААК'ЯН,
6. БРАГІНСКІ,
7. ХАЦКЕВІЧ.

Першым сакратаром ЦК КП(б)Б выбран тав. ГІКАЛО, другім сакратаром тав. ШАРАНГОВІЧ.

Па пытанню аб рэарганізацыі партыйных органаў пленумам прынята наступнае рашэнне: «Адобрыць тэзісы тав. КАГАНОВІЧА да XVII з'езда партыі па арганізацыйных пытаннях. Даручыць Бюро ЦК прадставіць канкрэтныя прапановы аб загадчыках аддзелаў і ўсёй рэарганізацыі як партапарата, так і совецкіх арганізацый к наступнаму пасяджэнню пленума ЦК, пасля XVII партыйнага з'езда».

Па пытанню аб рашэннях XV з'езда КП(б)Б і іх апублікаванні пленум пастанавіў: «Даручыць Бюро ЦК канчаткова адрэдагаваць усе пастановы з'езда і апублікаваць іх».

Адозва XV з'езда КП(б)Б

ДА ЎСІХ РАБОЧЫХ, ДА ЎСІХ КАЛГАСНІКАЎ, ДА ЎСІХ ПРАЦОЎНЫХ БЕЛАРУСІ, ДА ЎСІХ БАЙЦОЎ БЕЛАРУСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ

15 год назад пры брацкай дапамозе пролетарыята ўсяго СССР, разгромлены і выгнаны інтэрвентаў, была створана Беларуская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка.

Толькі на аснове аб'яднання сіл рабочага класа і сялянства ўсіх нацыянальнасцяй Совецкага Саюза пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, — Совецкая Беларусь адстаяла сваю незалежнасць і свабоду, усе заваяванні Окцябрскай рэволюцыі ад пасяганняў сусветнага імперыялізма, ад інтэрвентаў.

Крывёю лепшых сыноў роднай нашай гераічнай Чырвонай армії і партызан Беларусі ачышчана была Совецкая Беларусь ад германскіх інтэрвентаў, ад белапалякаў, ад белабандыцкіх шаек.

Гіганцкі вялікі гістарычны шлях прайшла Совецкая Беларуская Рэспубліка разам з усім Саюзам ССР за 15 год.

СССР стаў непрыступнай крэпасцю соцыялізма. Да яго накіраваны ўзрокі, надзеі пролетарыяў, прыгнечаных усяго земнага шара. Яны бачаць, як іх соцыялістычная бацькаўшчына ідзе пад сцягам Леніна, пад мудрым кіраўніцтвам вялікага Сталіна наперад ад перамогі да перамогі. Капіталістычны свет не выходзіць з усё паглыбляючагася сусветнага эканамічнага крызіса. Тухнуць домны, змаўкаюць машыны, заміраюць цэлыя гарады. Дзесяткі мільёнаў рабочых выкінуты за вароты прадпрыемстваў, на вуліцу, у абдымкі голаду і холаду, у рады армії беспрацоўных.

Працоўныя сяляне капіталістычных краін усё больш і больш разарэюцца, стогнучы пад ярмом капіталістычнай і памешчыцка-кулацкай кабалы і фашысцкага сваволля.

У нас, у СССР, растуць гіганты соцыялістычнай індустрыі. У выніку першай пяцігодкі СССР стаў перадавой індустрыяльна-аграрнай краінай.

Як ніколі згуртаваны вакол сваёй партыі, свайго вялікага правадыра тав. Сталіна рабочыя, калгаснікі, працоўныя вялікага Совецкага Саюза, цвёрда ўпэўненыя ў заўтрашнім дні.

Калгасны ў СССР лад перамог і перамог канчаткова і беспаваротна. Ліквідован у аснoўным апошні эксплаататарскі клас — кулацтва.

Усе гэтыя перамогі — неабвержнае сведчанне правільнасці генеральнай лініі нашай партыі, ленінскага кіраўніцтва ЦК партыі і нашага вялікага друга і настаўніка, геніяльнага правадыра тав. Сталіна.

Разам з ростам Совецкага Саюза расце і мацнее і яго перадавы фарпост на мяжы з заходня-капіталістычным светам — наша Совецкая Соцыялістычная Беларусь.

Непазнаванальнай стала наша рэспубліка за 15 год.

У мінулым—адсталая, збялелая калонія рускага царызма, дзе панавалі дзікі і бесгранічны нацыянальны гнёт, царскі бізун і памешчыцка-кулацкая кабала.

У мінулым — акраіна з саматужнай прамысловасцю, к таму-ж раз бураная імперыялістычнымі інтэрвентамі.

У мінулым — амаль паталоўчая непісьменнасць сярод рабочых і сялян.

Сваю 15-ю гадавіну БССР сустракае як адна з перадавых рэспублік Совецкага Саюза, ператварыўшыся ў індустрыяльна-аграрную краіну, рэспубліку соцыялістычных заводаў і фабрык, соўгасаў і калгасаў, рэспубліку суцэльнай пісьменнасці.

Магутны рост соцыялістычнай Беларусі — гэта трыумф ленінскай нацыянальнай палітыкі, наслядоўна і няўхільна праводзімай комуністычнай партыяй і канчаткова ліквідуючай эканамічную і культурную адсталасць былой царскай калоніі.

Гэта агрымлівае сваё яркае выражэнне і ў тым, што тэмпы развіцця прамысловасці БССР перавышаюць тэмпы прамысловага развіцця Совецкага Саюза ў цэлым, ставячы Беларусь на ўзровень перадавых прамысловых абласцей СССР.

На змену саматужным поўзаводам-поўмайстэрням пабудаваны гіганты буйнай індустрыі — бабруйскі камбінат, цэментны завод, фабрыка імя Куйбышава, «Сцяг індустрыялізацыі» і многія другія. Там, дзе раней былі глухія непраходныя балоты, цяпер гудуць турбіны Асінаўскай электрастанцыі, высоцца карпусы буйнейшага на ўсім СССР гомельскага цукразавода, растуць рыштаванні новых індустрыяльных будоўляў.

Звыш 50 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак БССР аб'яднаны ў калгасы. Умацаваныя пасланцамі партыі — палітаддзеламі, натхнёныя лозунгам нашага любімага тав. Сталіна аб тым, каб зрабіць калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі, — калгасы БССР ужо дасягнулі сур'ёзных поспехаў у барацьбе за арганізацыю вытворчасці, за высокі працадзень і ўраджай, за першачарговае выкананне сваіх абавязацельстваў перад пролетарскай дыяржавай.

На беларускай мове, мове роўнапраўнай з другімі мовамі народаў СССР, выходзяць сотні газет і журналаў, дзесяткі мільёнаў кніг. Нацменшасцям БССР забяспечана поўная магчымасць карыстацца роднаю мовай. Рост нашых ВНУ і школ, тэатраў, росквіт беларускай совецкай літаратуры — магутныя паказальнікі таржэства ленінскай нацыянальнай палітыкі, забяспечыўшай небывалы росквіт беларускай культуры, нацыянальнай па форме, соцыялістычнай па зместу.

Што забяспечыла нашы поспехі і перамогі?

Будаўніцтва соцыялізма ў Совецкай Беларусі ўзначальвае КП(б)Б—верны, выпрабаваны аград ленінскай ВКП(б), кіруемай правадыром сусветнага пролетарыята — нашым Сталіным.

КП(б)Б — адзіны правадыр і выразіцель інтарэсаў рабочага класа і працоўнага сялянства Беларусі — пад кіраўніцтвам ВКП(б) з першыхжа дзён свайго існавання бязлітасна змагалася супроць усіх дробнабуржуазных, кулацкіх, контррэволюцыйных партый—БСГ, эсэраў, Бунда, меншавікоў КП(б)Б разграміла гэтыя контррэволюцыйныя партыі, выкрыўшы іх перад шырокімі масамі, як прамых агентаў буржуазіі і памешчыкаў, як верных лакеяў ім перыялістычных антысовецкіх інтэрвентаў.

КП(б)Б непрымірыма змагалася супроць усіх і ўсякіх адхіленняў пролетарскай рэволюцыі — правых апартуністаў, контррэволюцыйных трацкістаў, цвёрда захоўваючы чыстату генеральнай лініі партыі і адзінства партыйных радоў.

Наша партыя сакрушыла вылазкі вялікадзяржаўных элементаў, выступаўшых супроць большэвіцкай беларусізацыі, і разграміла контррэволюцыйных беларускіх нацдэмаў, нацыянал-апартуністаў—гэтых зброя носцаў імперыялістычнай інтэрвенцыі, прабаваўшых адарваць БССР ад Совецкага Саюза, ператварыць нашу краіну ў калонію еўрапейскага фашызма.

Совецкая Соцыялістычная Беларусь — неадлучная частка ўсяго СССР. Нашы поспехі, нашы перамогі—рэзультат штодзённай дапамогі з боку ўсяго Совецкага Саюза. Гэта дапамога найпрэйшы сімвал ленінскага пролетарскага інтэрнацыяналізма.

Таварышы! XVII з'езд нашай ленінскай партыі зацвердзіць праграму пабудовы бясклассавага соцыялістычнага грамадства, разгорнутую ў тэзісах дакладаў т. т. Молатава, Куйбышава і Кагановіча.

Мы ўступілі ў велізарнейшы сусветна-гістарычны перыяд — завяршэння соцыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі, пабудовы бясклассавага соцыялістычнага грамадства.

СССР у другім пяцігодцы стане тэхніка-эканамічна незалежнай краінай і самай перадавой у тэхнічных адносінах дзяржавай. Непамерна вырасце несакрушальная абарона нашай соцыялістычнай бацькаўшчыны. Удвая-ўтрая вырасце матэрыяльны ўзровень рабочых, калгаснікаў, працоўных нашай краіны.

Другая пяцігодка—пяцігодка ліквідацыі капіталістычных элементаў і класаў наогул. Але класы не знікнуць самі сабой. Ленін вучыў нас, што знішчэнне класаў ёсць працэс упартай і абвостранай класавай барацьбы.

Астаткі капіталістычных элементаў і іх агентура—беларускі нацдэм, шавіністы, трацкісты, буйлавец, эсэр, саюзнікі недабітага кулацтва —правыя апартуністы будуць яшчэ прабаваць сарваць будаўніцтва соцыялізма, затармазіць соцыялістычнае наступленне.

Яшчэ вышэй узнімем нашу класавую пільнасць. Мацней удар па ўсіх ворагах партыі і рабочага класа. Бязлітасная барацьба з беларускім нацыяналізмам, які з'яўляецца ў нашай рэспубліцы галоўнай небяспекай у нацыянальным пытанні на даным этапе.

Вышэй сцяг барацьбы за генеральную лінію партыі, за ленінскую нацыянальную палітыку, за пролетарскі інтэрнацыяналізм.

Таварышы рабочыя і работніцы!

Ваш абавязак, ваша кроўная справа—умацаваць соцыялістычную дысцыпліну на прадпрыемстве, у цэху, на чыгуначным транспарце, павысіць прадукцыйнасць працы, змагацца за высокую якасць прадукцыі і вывучыць тэхніку як свае пяць пальцаў, асвоіць кожны новы варштат, асвоіць кожную новую машыну.

Няхай ярчэй разгараецца агні соцыялістычнага спаборніцтва над кожным заводам і фабрыкай. Множце ралы ўдарнікаў, ідзіце дарогай лепшых людзей нашай эпохі — герояў соцыялістычнай працы.

Таварышы калгаснікі і калгаснікі!

Партыя і совецкая ўлада стварылі вам усе ўмовы для таго, каб стаць заможнымі. Толькі ад вас, ад якасці вашай працы залежаць цяпер тэмпы росту вашага добрабыту.

Працуйце чесна, берагіце калгаснае дабро, свята выконвайце свае абавязацельствы перад дзяржавай.

Дружней за работу, таварышы калгаснікі! Дружней за палрыхтоўку дастойнай сустрэчы другой большэвіцкай вясны другой большэвіцкай пяцігодкі.

Таварышы працоўныя адпаасобнікі!

Само жыццё даказала, што адзіны шлях да новага светлага заможнага жыцця — шлях калгасаў. На гэты шлях кліча вас партыя. Завершым у другой пяцігодцы поўнасцю калектывізацыю беларускай вёскі.

Таварышы чырвонаармейцы, камандзіры, палітработнікі Беларускай Ваеннай Акругі, XV з'езд КП(б)Б шле вам гарачае большэвіцкае прывітанне. З'езд заклікае вас на аснове агромадных поспехаў у баявой і палітычнай вучобе, у аўдаданні тэхнікай, якія вы заваявалі ў мінулым годзе і якія паставілі вашу акругу ў пераадзвыя рады ўсёй Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, —яшчэ мацней біцца за справу бая вога ўдасканалення сваіх часцей, каб зрабіць іх сапраўды непераможным аплотам соцыялістычнага будаўніцтва. Стралок, кавалерыст, лётнік, танкіст Чырвонай армії павінен быць лепшым стралком, кавалерыстам, лётнікам, танкістам у свеце. Стралок, кавалерыст, лётнік, танкіст Беларускай Ваеннай Акругі павінен быць лепшым стралком, кавалерыстам, лётнікам, танкістам у Рабоча-Сялянскай Чырвонай армії.

Таварышы рабочыя, калгаснікі, чырвонаармейцы і ўсе працоўныя БССР!

Шмат намі зроблена, гіганцкія перамогі намі атрыманы. Найвялікшыя труднасці пераможаны намі. Але яшчэ больш гіганцкія задачы стаяць перад намі ў другім пяцігодзі. Яшчэ больш настарожаныя, больш зоркімі павінны мы быць у абстаноўцы рэальна насцяваючай небяспекі ўзброенага нападу на нас імперыялістаў на Ўсходзе і на Захадзе.

XV з'езд КП(б)Б кліча вас яшчэ цясней згуртавацца вакол партыі, вакол любімага правадыра партыі і сусветнага пролетарыята тав. Сталіна, яшчэ вышэй узняць свой вытворчы энтузіязм, яшчэ мацней адтачыць сваю класавую пільнасць, сакрушаючы ўсякія прошукі ворага, яшчэ больш мацаваць абарону нашай краіны, магутнасць Чырвонай армії.

Таварышы! За нашай работай, за нашай соцыялістычнай будоўляй сочыць увесь свет. Кожная новая напа нерамога на фронце будаўніцтва соцыялістычнага грамадства — удар па старому свету.

Кожны наш новы поспех натхняе пролетарыяў і ўсіх прыгнечаных гатоўнасцю да далейшай барацьбы, да новых класавых баёў за пролетарскую рэволюцыю.

Няхай жыве наш любімы правадыр і настаўнік тав. Сталін!

Няхай жыве комуністычная партыя!

Няхай жывуць рабочыя і калгаснікі краіны Совецкаў!

Няхай жыве сусветны Окцябр!

XV З'ЕЗД КП(б)Б

15 ГОД КП(б)Б І БССР

Даклад тав. ШАРАНГОВІЧА на 15-м з'ездзе КП(б)Б

Таварышы! 15 з'езд КП(б)Б супадае з вялікімі гістарычнымі датамі — з пятнаццацігоддзем утварэння БССР, як самастойнай совецкай сацыялістычнай рэспублікі, і першага з'езда комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі.

Наш 15 з'езд сабраўся напярэдадні 17-га з'езда Усесаюзнай Комуністычнай партыі.

15-гадовы юбілей КП(б)Б і БССР супадае з 10-й гадавінай з дня смерці тварца і настаўніка нашай партыі Леніна, сцяг якога моцна трымае ў руках любімейшы правадыр і настаўнік нашай партыі і між народнага пролетарыята, лепшы прадаўжальнік справы Леніна — тав. Сталін, які вядзе краіну Совецтаў ад перамогі да перамогі.

Іменна тав. Сталін, больш чым хто-небудзь другі, будучы загружаны буйнейшымі справамі і, у прыватнасці, справамі па арганізацыі перамог нашай Чырвонай армії на франтах грамадзянскай вайны, канкрэтна і аператыўна кіраваў справай утварэння БССР, вучыў нашу партыю арганізоўваць барацьбу супроць усіх і ўсякіх контррэволюцыйных выступленняў, распазнаваць і ўсарываць усіх і ўсякіх нацыяналістаў і социял-здраднікаў, якія прабавалі навіраваць развіццё нашай рэспублікі на капіталістычнаму шляху.

У маю задачу не ўваходзіць **падрабязнае** вылажэнне гісторыі развіцця большэвізма на Беларусі. Гэта ў першую чаргу справа гісторыкаў, якія, к слову сказаць, працуюць у нас яшчэ вельмі дрэнна. У сваім дакладзе я думаю спыніцца на асноўных этапах развіцця большэвізма на Беларусі, на ролі большэвіцкай партыі ў барацьбе за Окцябр, у барацьбе за дыктатуру пролетарыята і яе ўмацаванне.

Гістарычныя карэнні і асноўныя этапы большэвізма на Беларусі

Таварышы, КП(б)Б з'яўляецца адным з атрадаў усёй ВКП(б). 30-31 снежня 1918 года ў Смаленску адбыўся першы з'езд комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі, які абвясціў Беларусь самастойнай совецкай социялістычнай рэспублікай. Аднак, гісторыя большэвізма на Беларусі пачынаецца значна раней — яна пачынаецца разам з гісторыяй большэвізма ў Расіі, калі вакол ленінскага калектыўнага арганізатара, вакол старой «Искры» ва ўсёй былой царскай Расіі збіраліся і кансалідаваліся сілы для ўтварэння новай пролетарскай партыі, баявой партыі міжнароднай пролетарскай рэволюцыі, партыі новага тыпу, партыі, якой не ведала папярэдняя гісторыя міжнароднага рэволюцыйнага руху.

Вы ўжо ведаеце з цэлага раду дакумантаў, што на Беларусі, яшчэ да рэволюцыі 1905 года існавалі і дзейнічалі большэвіцкія арганізацыі і групы. Гэтыя большэвіцкія арганізацыі ў эпоху рэволюцыі 1905 года разгарнулі шырокую работу сярод рабочых і сялян і вялі ўпартую барацьбу супроць апартунізма і нацыяналізма ўсіх масцей і адценняў, супроць Бунда супроць Беларускай социялістычнай грамады, супроць меншавікоў і эсэраў, супроць усіх і ўсякіх дробна-буржуазных нацыяналістычных партый.

Вы ведаеце аб той аграмадзнай ролі, якую адыграў палескі большэвіцкі камітэт у перыяд паміж лютым і кастрычнікам 1917 года, калі на чале камітэта стаяў Лазар Майсеевіч Каганові**ч (аппескі).**

Таварышы, гісторыя большэвізма Беларусі прайшла праз тыя гістарычныя этапы, праз якія прайшла ўся наша ленінская партыя. Владзімір Ільіч Ленін гэтыя галоўныя этапы гісторыі большэвізма да Окцябрскай рэволюцыі вызначаў наступным чынам: годы падрыхтоўкі рэволюцыі (1903—1905); годы рэволюцыі (1905--1907); годы рэакцыі (1907-1910); годы пад'ёму (1910-1914); годы першай сусветнай імперыялістычнай вайны (1914-1917); другая рэволюцыя ў Расіі (з лютага па кастрычнік 1917 г.).

Гэтыя этапы прайшоў большэвізм і на Беларусі.

Супроць фальсіфікацыі гісторыі большэвізма

Большэвізм на Беларусі нарадзіўся і развіўся ад расійскага большэвізма, ад РСДРП большэвікоў, а не ад тых ці іншых нацыяналістычных арганізацый, накшталт БСГ, або Бунда, як гэта не раз прабавалі давесці, і нават працягвалі свае довады ў нашу літаратуру, асобныя былыя дзеячы БСГ і бундаўцы. Яшчэ і да гэтага часу сям-там гуляе «тэорыя» аб двухкарэннасці КП(б)Б. Згодна гэтай тэорыі КП(б)Б развівалася, з аднаго боку, ад большэвіцкіх арганізацый, якія дзейнічалі тут на Беларусі, а, з другога боку, ад дробна-буржуазных нацыяналістычных партый тыпу БСГ, Бунда і т. д.

Гэта ёсць грубейшае скажэнне гісторыі КП(б)Б, гэта ёсць гнусная фальсіфікацыя, гэта — паклёп на нашу партыю, спробы змазаць перад працоўнымі масамі тую вялікую рэволюцыйную кіруючую ролю, якую большэвіцкія арганізацыі адыгралі ў час падрыхтоўкі і арганізацыі Окцябра, у час адстойвання і замацавання яго завяванняў на Беларусі.

Нам трэба раз назаўсёды выкрыць усіх гэтых фальсіфікатараў, усіх тых «гісторыкаў», якія прабуюць сказіць гісторыю развіцця большэвізма на Беларусі. Усе тыя этапы, якія прайшоў большэвізм на Беларусі да свайго першага з'езда КП(б)Б і пасля яго, знаходзяцца ў непарыўнай і ненадзённай сувязі з усёй гісторыяй ВКП(б). Адзінства і агульнасць гістарычнага працэса ўсёй ВКП(б) і яе атрада КП(б)Б абумоўліваюцца адзінствам социяльна-эканамічных прадпасылак пролетарскай рэволюцыі, адзінствам задач, якія стаялі перад большэвікамі як у часе падрыхтоўкі Окцябра, так і на ўсіх этапах барацьбы за пролетарскую рэволюцыю, за дыктатуру пролетарыята, за комунізм.

Партыя ў барацьбе за дыктатуру пролетарыята

Зразумела, што КП(б)Б мела і мае свае асаблівасці, выцякаючыя з асаблівасцяй гістарычнага развіцця Беларусі, як былой калоніі царскай Расіі.

Ленін вучыў:

«Пакуль існуюць нацыянальныя і дзяржаўныя рознасці паміж народамі і краінамі, — а гэтыя рознасці будуць трымацца яшчэ вельмі і вельмі доўга, нават пасля ажыццяўлення дыктатуры пролетарыята ў сусветным маштабе, — адзінства інтэрнацыянальнай тактыкі комуністычнага рабочага руху ўсіх краін патрабуе не ўстаравання рознастойнасці, не знішчэння нацыянальных рознасцяй (гэта—ведарэчная мара для данага моманту), а такога прымянення **асноўных** прынцыпаў комунізма (совецкая ўлада і дыктатура пролетарыята), якое-б **правільна відазмяняла** гэтыя прынцыпы ў **прыватнасцях,** правільна прыстасоўвала, прымяняла іх да нацыянальных і нацыянальна-дзяржаўных рознасцяй. Даследаваць, вывучыць, адшукаць, угадаць, схапіць нацыянальна-асаблівае, нацыянальна-спецыфічнае ў **канкрэтных** падыходах кожнай краіны да вырашэння **адзінай** інтэрнацыянальнай задачы, ці перамогі над апартунізмам і левым доктрынерствам унутры рабочага руху, да звяржэння буржуазіі, да ўстанаўлення совецкай рэспублікі і пролетарскай дыктатуры — вось у чым галоўная задача перажываемага ўсімі перадавымі (і не толькі перадавымі) краінамі гістарычнага моманту» (Ленін, том 25, выд. 2, стар. 229).

Гэтыя асаблівасці, аб якіх гаварыў тав. Ленін, ВКП(б) цалкам і яе баявым атрадам—большэвікамі Беларусі ўлічваліся на ўсіх этапах нашай барацьбы за дыктатуру пролетарыята. **ВКП(б) і яе неадрыўны атрад большэвікі Беларусі, а не хто іншы былі арганізатарамі падрыхтоўкі і перамог Окцябра, арганізатарамі барацьбы за Совецкую Беларусь.**

Было-б таксама грубейшым скажэннем, калі-б мы барацьбу за дыктатуру пролетарыята на Беларусі бралі ізалявана, бралі-б у адрыве ад усіх тых падзей, якія адбываліся ва ўсёй былой царскай Расіі. Барацьба за Окцябр на Беларусі была справай усяго пролетарыята і працоўнага сялянства былой Расійскай імперыі. Дыктатура пролетарыята на Беларусі была заваявана працоўнымі Беларусі разам з працоўнымі Ленінграда і Масквы, Растова і Харкава, Тулы і Ніжняга Ноўгарада, яна была заваявана пад кіраўніцтвам партыі і яе геніяльных правадыроў Леніна і Сталіна.

Абвяшчэнне БССР з'яўляецца паказальнікам велізарных поспехаў першых 14-ці месяцаў Окцябрскай рэволюцыі, адзначае перамогу пролетарыята і працоўнага сялянства ў барацьбе за ўмацаванне дыктатуры пролетарыята, за социялістычную перабудову ўсяго грамадства, у тым ліку і ў галіне нацыянальных адносін і культурнага будаўніцтва.

Барацьба за Совецкую Беларусь сустрэла на сваім шляху асаблівыя труднасці. БССР перажыла паласу акупацый. Вызваленне БССР 11-га ліпеня 1920 года з-пад польскай акупацыі з'яўляецца не менш яркім паказальнікам новых перамог працоўных мас Беларусі, паказальнікам іх новых дасягненняў, якія магчымы былі толькі дзякуючы непаарэднай рашаючай дапамозе пролетарыята ўсяго Совецкага Саюза.

І абвяшчэнне БССР, і канчатковае вызваленне Совецкай Беларусі з-пад улады белапольскіх акупантаў было рэзультатам умацавання дыктатуры пролетарыята ва ўсім СССР, рэзультатам мабілізацыі па абарону совецкай улады новых мільёнаў рабочых і сялян, рэзультатам росту сусветнай пролетарскай рэволюцыі, рэзультатам перамог нашай гераічнай Чырвонай арміі. Гэтыя перамогі былі атрыманы агульнымі намаганнямі ўсяго расійскага пролетарыята і працоўных мас пад кіраўніцтвам вялікай партыі Леніна-Сталіна. Гэтыя перамогі былі заваяваны на аснове згуртавання вакол совецкай улады ўсяго рабочага класа і працоўнага сялянства, на аснове буйных перамог Чырвонай арміі на шматлікіх франтах грамадзянскай вайны і рэволюцыйнага паўстання ў Германіі, Аўстра-Венгрыі і інш., на аснове сумеснай гераічнай барацьбы рабочых і працоўных мас Расіі, пры кіруючай ролі рабочых асноўных прамысловых цэнтраў, разам з рабочымі і працоўнымі масамі Беларусі.

Трэба з усёй сілай адкінуць, адмесці ўсякага роду «тэорыі» і «тэорыйкі», якія, на вялікі жаль, час-ад-часу прасякаюць у нашу літаратуру і з'яўляюцца ні больш, ні менш як спробай фальсіфікаваць гісторыю рэволюцыйнай барацьбы за Совецкую Беларусь. Адна з такіх, асабліва пашыраных «тэорый» зводзіцца к таму, што абвяшчэнне БССР — гэты гістарычны акт, які быў зроблен 15 год таму назад, быў падрыхтован пражываючымі ў Маскве, Ленінградзе і іншых рускіх гарадах групамі беларускіх інтэлігентаў і што рабочыя і сяляне Беларусі, уласна кажучы, не маюць да гэтага акту амаль што ніякіх дачыненняў. Гэта, з дазволу сказаць, «тэорыя» з'яўляецца шкоднай фальсіфікацыяй гісторыі рэволюцыйнага руху на Беларусі і нічога агульнага з большэвіцкай гісторыяй не мае. Не трэба даводзіць, што гэтая «тэорыя» з'яўляецца «вынаходствам» нацдэмаўскага парадку, з'яўляецца спробай пратаўкнуць думку аб выключнай месіянскай ролі беларускай нацыяналістычнай інтэлігенцыі, думкі, якая ў свой час асабліва рашуча падтрымлівалася такім «гісторыкам», як нацдэм Ігнатоўскі і інш.

Не менш грубай фальсіфікацыяй рэволюцыйнага руху на Беларусі з'яўляецца і такая думка, што быццам-бы рабочы клас на Беларусі не адыгрываў кіруючай ролі ў падрыхтоўцы рэволюцыі, што рэволюцыя «прышла ад цяжкіх сох», што яна была ў нас выключна сялянскай рэволюцыяй.

Беларусь напярэдадні Окцябра

Беларусь у мінулым гэта — калонія царскай імперыі, краіна социяльнага і нацыянальнага прыгнечання, краіна эканамічнай і культурнай адсталасці.

Мяшчанскія з самалужнай прамысловасцю гарады, палова зямлі ў памешчыкаў, калі не лічыць нават кулакоў, на долю якіх прыпадала амаль што палова астатняй зямлі; 70 проц. непісьменных; краіна беспраўсветнай галечы і поўталоднага існавання — беднаты ў горадзе, вёсцы і мястэчку; краіна сярэдневяковай чарты аседласці—такі твар дарэволюцыйнай Беларусі.

Аб мінулым Беларусі сведчаць наступныя даныя.

а) **У галіне прамысловасці:**

Паводле існуючых вылічэнняў даход ад прамысловасці ў 1913 годзе складаў каля 17 проц.; прамысловасць насіла пераважна рамесніцка-саматужны характар; прадукцыя фабрычна-заводскіх прадпрыемстваў складала каля 28,4 проц. прадукцыі ўсёй прамысловасці; нацыянальны даход ад фабрычна-заводскай прамысловасці ў Беларусі ў даваенны час складаў 4,9 проц.; рабочых налічвалася прыблізна 23 тысячы чалавек; імперыялістычная і грамадзянская вайна цяжка адбілася на становішчы асноўнага капіталу ў прамысловасці, асабліва вялікія страты прамысловасці былі нанесены белапольскай акупацыяй.

б) **У галіне сельскай гаспадаркі:**

Да рэволюцыі больш паловы ўсёй зямлі Беларусі (сюды ўключаюцца Менская, Магілеўская, Віцебская, Віленская і Гарадзенская губерні) належала купцам, панам, княжам, папам; з 22.228.000 дзесяцін належала памешчыкам, княжам, царквам і манастырам 11.645.000 дзесяцін, а на долю ўсіх сялян, уключаючы і кулакоў, прыпадала 10.384.000 дзесяцін. Такая колькасць зямлі была ў руках 4 млн. сялян — беднякоў, сераднякоў, у тым ліку і кулакоў.

На Беларусі прыблізна было 200 тысяч батракоў. Малазямелле і беззямелле прымушалі сялянскую беднату ісці на заробкі і перасяляцца ў другія краіны. За 20 год перасялілася ў Сібір 642 тысячы чалавек, выехала ў Амерыку 800 тысяч, а асноўная беднота і маламоцная частка сераднякоў гнулі спіну на рабоце ў кулакоў і памешчыкаў.

в) **У галіне культуры:**

Па перапісу 1891 года ў сельскіх мясцовасцях Беларусі на тысячу душ насельніцтва прыпадала ўсяго 142 граматных, к прыходу совецкай улады процант непісьменнасці сярод сялянскага насельніцтва не раўнуўся 75 проц. Царскі ўрад забараняў выкладанне ў школах на родной мове, праз школу праводзілася гвалтоўная русіфікацыя беларускага, польскага і яўрэйскага насельніцтва. Беларускіх школ у царскай Расіі не было; зразумела, не было на Беларусі і ні адной вышэйшай навучальнай установы.

Вось малюнак социяльна-эканамічнага і культурнага становішча Беларусі ў мінулы час, напярэдадні Окцябра.

Окцябрская рэволюцыя, з'яўляючыся адзіным працэсам на тэрыторыі ўсёй былой царскай Расіі, праходзіла пад кіраўніцтвам толькі адной і адзінай партыі — партыі большэвікоў. Гэты працэс відаэмяняўся ў прыватнасцях у нац. раёнах адпаведна іх нацыянальным асаблівасцям.

Пролетарыят Беларусі з'яўляўся той сілай, якая, ідучы ў сваёй большасці яшчэ да Окцябра за большэвікамі, разам з пролетарыятам усёй Расіі стаяла на чале социяльна- і нацыянальна вызваленчага руху на Беларусі і вяла за сабой працоўнае сялянства на барацьбу за совецкую ўладу, за дыктатуру пролетарыята. Наяўнасць у вялікай колькасці с.-г. рабочых і сувязь гарадскіх рабочых з вёскай з'яўлялася важнейшым каналам большэвіцкага ўплыву на вёсцы. Гэты фактар дапаўняўся і ўзмацняўся другім станоўчым фактарам, як наяўнасць на тэрыторыі Беларусі кадраў рабочых з буйных прадпрыемстваў Расіі (цуцілаўцы, абухоўцы і інш.), якія засланы былі царскім урадам у армію, на фронт і з'явіліся лепшымі настаўнікамі для нашых мясцовых рабочых кадраў. Гэтыя фактары спрыялі значнаму росту рэволюцыйнага руху на Беларусі ў час вайны і да яе.

Становішча вёскі напярэдадні Окцябра можна коратка характарызаваць наступнымі асноўнымі момантамі:

У руках памешчыкаў знаходзілася, як я ўжо гаварыў вышэй, каля паловы ўсёй зямлі;

узмацненне працэса дыферэнцыяцыі сялянства выклікала абвастрэнне барацьбы сялян за зямлю;

наяўнасць вялікай праслойкі сельскагаспадарчага пролетарыята.

Наша партыя ў барацьбе за масы

Становішча, якое мелася ў сельскай гаспадарцы на Беларусі ў часе Окцябра, асабліва прыкоўвала ўвагу партыі большэвікоў да вырашэння аграрнага пытання, да вырашэння пытання аб зямлі, як часткі агульнага пытання аб пролетарскай рэволюцыі. Толькі адна наша партыя большэвікоў прама і ясна ставіла пытанне аб зямлі. Гэта ясная пастаноўка аграрнага пытання нашай партыяй адыграла агромадзнейшую ролю ў барацьбе за масы і асабліва за сялянскія масы, сярод якіх быў значны ўплыў эсэраў. У часе Окцябрскай рэволюцыі і яшчэ напярэдадні яе асноўныя масы сялянства пайшлі за большэвікамі, пад лозунгамі нашай партыі. **Правільнае вырашэнне пытання аб зямлі, правільнае вырашэнне пытання аб міры, паслядоўнае ажыццяўленне ленінскай нацыянальнай палітыкі ў Беларусі згуртавалі вакол пролетарыята і яго партыі шырокія масы працоўнага сялянства, звязалі барацьбу працоўных Беларусі з барацьбой усяго расійскага пролетарыята за пролетарскую дыктатуру.** Аб гэтым сведчаць хоць-бы наступныя факты: Выбары ў «учредительное собрание», якія адбыліся ў канцы лістапада 1917 года, паказваюць такі малюнак: на Заходняму фронту большэвікі атрымалі 66,7 проц. усіх галасоў, у той час як дробнабуржуазныя партыі — эсэры, меншавікі, народныя і украінскія социялісты — усе разам атрымалі 28 проц. усіх галасоў. З гэтага ліку меншавікі атрымалі ўсяго 0,7 проц. галасоў, эсэры — 19,3 проц., а БСГ, якая блакіравалася з буржуазнымі беларускімі арганізацыямі, атрымала ўсяго 0,6 проц. галасоў, партыі памешчыкаў і буржуазіі атрымалі 5,3 проц. галасоў. Прыблізна такі-ж малюнак мы бачым і па Менскаму і па Віцебскаму выбарчым участкам. Па Менскаму ўчастку большэвікі атрымалі 63,2 проц. галасоў, а па Віцебскаму — 51 проц. усіх галасоў. Бундаўцы і меншавікі па Менскай акрузе атрымалі 1,3 проц. галасоў, а БСГ толькі — 0,3 проц. У абсалютных лічбах за БСГ галасавала ўсяго 2.988 галасоў. Партыі памешчыкаў і буржуазіі атрымалі па Беларусі 13,7 проц. галасоў. Як мы бачым, партыя большэвікоў у барацьбе за масы атрымала буйнейшыя перамогі як у арміі на фронце, так і ў тылу — на асноўных выбарчых участках.

На з'ездзе салдацкіх дэпутатаў Заходняга фронта, які адкрыўся 20-га лістапада 1917 года, большэвікі маюць 473 дэлегаты, левыя эсэры — 74, эсэры цэнтра — 2, правыя эсэры — 5, максімалісты — 9, анархісты — 5, меншавікі — 94 і беспартыйныя — 105 дэлегатаў.

На абласным з'ездзе совецтаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў (з'езд адкрыўся 19 лістапада 1917 года) дзве трэці ўсяго складу прадстаўляюць большэвікі, адну трэць складаюць левыя эсэры; правыя эсэры маюць толькі аднаго прадстаўніка.

Барацьба большэвікоў за масы супроць усіх гэтых дробна-буржуазных і нацыяналістычных партый, выкрыццё іх здрадніцкай ролі спрыяла рэволюцыйнаму ўздыму рабочых мас і салдат у арміі.

Вось факты. Менскі камітэт сялянскага саюза прыняў наступную пастанову:

«1. Беларускі нацыянальны камітэт ні ў якім выпадку не можа быць прызнаны выразіцелем думкі ўсяго беларускага народа і не мае права гаварыць ад яго імя, бо беларускі народ у асобе сваіх працоўных класаў — сялян і рабочых — у работах нацыянальнага з'езда ніякага ўдзела не прымаў.

2. «Беларускі нацыянальны камітэт», з'яўляючыся па свайму складу арганізацыяй маёмасных пластоў землеўласнікаў, а па характару сваіх выступленняў чыста нацыяналістычным, пагражае інтарэсам сялян і рабочых, імкненнем адарваць іх на хлебе, ўзмоцнена падагараемага нацыяналізма ад працоўных мас усёй Расіі і падначаліць ідэйнаму кіраўніцтву памешчыкаў».

Далей камітэт сялянскага саюза заяўляе, што будзе весці бязлітасную барацьбу з «нацыянальным камітэтам», бо дзейнасць яго можа прывесці к «розні ў радах працоўнага народа і тым перашкодзіць яму дабіцца карэнных змен яго эканамічнага і палітычнага становішча».

Што датычыцца настрою салдат, то гэты настрой увесь час складваецца на карысць большэвікоў. Вось прыклад: на мітынгу 675 пяхотнага канатопскага палка (169 дывізія 10 армейскага корпуса) была вынесена наступная рэзалюцыя:

«не давяраем часоваму ўраду, які праводзіць палітыку буржуазіі. Прапануем яго членам перастаць сябе называць социялістамі, каб не ўводзіць народ у блытаніну. Патрабуем пераходу ўрада ў рукі салдацкіх, рабочых, сялянскіх і батрацкіх дэпутатаў. Патрабуем склікання франтавога з'езда, як выразіцеля настрояў салдат дзейсвуючай арміі... Наступленне ніякага быць не можа, а можа быць толькі абарона»...

Большэвікі ў арміі былі той арганізуючай сілай, вакол якой нарасталі рэволюцыйныя падзеі. У сваіх тэлеграмах камандаванне гэтага не ўтойвала. Вось што, напрыклад, пісаў у сваёй тэлеграме камандзір 68 корпуса Доўбар-Мусніцкі, якога добра ведаюць рабочыя і сяляне Беларусі па крывавай рабоце яго легіёнаў у пачатку 1918 года:

«Сёння прыбыла да мяне дэпутацыя 43 сібірскага палка, лепшага палка корпуса, якая заявіла, што барацьба з прапагандай ленінцаў-большэвікоў становіцца непасільнай. Унтэр-афіцэры і фельдфебелі просяць паставіць іх у строй у якасці радавых, бо справіцца з людзьмі не могуць. У рабіе корпуса нейкія невядомыя салдаты пад прыкрыццём цемры пранікаюць на бівуакі і муцяць салдат, падбіваючы іх не ісці ў наступ, затым шпарка знікаюць. Злавіць такіх агітатараў не ўдалося, агітацыя-ж дае плады... Крайне неабходны рашучыя меры з боку ўрада для барацьбы з ленінскай прапагандай, аб чым і просяць афіцэры...»

(Доўбар-Мусніцкі. Тэлеграма ў штаб 10-й арміі ад 9 чэрвеня 1917 г.).

Рост аўтарытэта большэвікоў сярод салдат арміі выклікаў паніку сярод камандзнага афіцэрскага оклада. Для характарыстыкі такога панічнага настрою ў асяроддзі контррэволюцыйнага афіцэрства можна прывесці адзін надзвычайна цікавы дакумент. Камандзір 61-га палка ў сувязі з прыездам у яго часць агітатара большэвіка дае па начальству наступную тэлеграму:

«Маладзечна, 11 чэрвеня 1917 г., 19 гадз. 10 мін.

Данашну копію данясення, якое атрымаў камкор сібірскага ад кампалка 61-й стр. дывізіі: «мне і афіцэрам застаецца толькі ратавацца, бо прыехаў з Петраграда дэпутат — салдат 5-й роты, ленінец. У 16 гадз. будзе мітынг. Ужо вырашана мяне, Марозко і Ягорава павесіць. Я еду ў Лашаны. Без рашучых мер нічога не будзе... Палкоўнік Траўнікаў».

Такім быў у асноўным уплыў большэвікоў на салдацкія масы ў арміі як на фронце, так і ў тылу. Характэрным дляازнаення настрояў салдацкіх мас перад Окцябрскай рэволюцыяй з'яўляецца тое, што газета «Звязда» і інш. большэвіцкая літаратура зачытвалася салдатамі літаралі на да дзюр і на «Звязду» салдаты збіралі ўсе свае зберажэнні, ствараючы яе «жалезны фонд».

Значэнне тых падзей, якія адбываліся напярэдадні Окцябра на тэрыторыі Беларусі паглыблялася тым, што Беларусь з'яўлялася плацдармам імперыялістычнай вайны, што на франтах гэтай вайны канцэнтравалася ўвага не толькі рэволюцыйных сіл, але і сіл контррэволюцыі. **Беларусь у 1917 г. была арэнай не толькі барацьбы мясцовых класавых сіл, але і ўсерасійскай арэнай барацьбы класаў, барацьбы партый.**

Контррэволюцыйная роля дробна-буржуазных партый

Поспехі, з якімі мы прышлі к 15 з'езду КП(б)Б, сталі магчымы толькі таму, што КП(б)Б на ўсіх этапах свайго існавання паслядоўна ажыццяўляла генеральную лінію партыі і вяла непрымірымую барацьбу з усімі ўхіламі ад яе, з нацыяналістычнымі ўхіламі і плынямі ў партыі, супроць меншавікоў і эсэраў, супроць усіх і ўсякіх дробна-буржуазных і нацыяналістычных партый, якія з'яўляліся актыўнымі барацьбітамі ў лагеры контррэволюцыі.

Што сабой прадстаўлялі ў гэты час тыя партыі, якія існавалі на Беларусі і як наша большэвіцкая партыя вяла з імі барацьбу? Якую ролю адыграла на Беларусі партыя эсэраў? Трэба сказаць, што ўплыў эсэраў, якія прыкрываліся левымі фразамі, на сялянскія масы ў часе Керанскіны быў значным. У прыватнасці, эсэры адыгрывалі значную ролю на 2-м сялянскім з'ездзе ў Менскай і Віленскай губ., дзе ім на пэўным этапе (к маю 1917 года) удалося заваяваць большасць сялянскіх і ваенных камітэтаў. Напярэдадні Окцябрскай рэволюцыі большэвікі вялі ўпартую барацьбу супроць эсэраў, паспяхова адваёўваючы ад іх сялянскія масы і ўскрываючы пралажны твар гэтай партыі. Як вядома, далейшы шлях партыі эсэраў — шлях актыўнай барацьбы супроць сялянскага руху, які пад уплывам большэвікоў нарастаў бурным тэмпам. Пад лозунгам — чакаць «учредительного собрания» — эсэры змагаліся супроць захвату памешчыцкай зямлі сялянамі.

Гэты перыяд барацьбы за Окцябр, барацьбы за масы супроць контррэволюцыйных, дробна-буржуазных партый т. СТАЛІН характарызуе наступным чынам:

«Характэрнай рысай гэтага перыяда з'яўляецца далейшае рэволюцыянізаванне працоўных мас сялянства, іх расчараванне ў эсэрах і меншавіках, іх адыход ад гэтых партый, іх паварот у бок прамога аб'яднання вакол пролетарыята, як адзінага ла весці краіну да міра. («Пытанні ленініз ма», выд. 9-е 1933 г., стар. 252).

Наша партыя ўсімі мерамі і сродкамі выкрывала контррэволюцыйны здрадніцкі твар дробна-буржуазных партый. Эсэраўскаму лозунгу чакання ўчрадзілкі процпаставіла і на справе ажыццяўляла лозунг безадкладнай перадачы зямлі сялянам. Большэвікі дабіліся таго, што к часу Окцябра зямля фактычна перайшла ў рукі яе сапраўдных гаспадароў — сялян, выкрыўшы такім чынам поўны здрадніцкі твар эсэраў і заваяваўшы сімпатыі асноўных мас сялянства на свой бок.

Таварышы, у нас яшчэ і да гэтай пары маюцца ў ходу думкі аб тым, што быццам-бы так званая Беларуская социялістычная грамада мела ўплыў на развіццё падзей да Окцябра і ў час окцябрскага перавароту. Гэта абсалютна няправільна. Што прадстаўляла сабою БСГ у час Окцябра? Гэта была маленькая група інтэлігентаў, якая актыўна грала на руку контррэволюцыі.

Для таго, каб не затрымліваць вашай увагі, я прыведу толькі вытрымку з аднаго дакумента, з артыкула вядомага вам дзеяча, па сутнасці справы, аднаго з кіраўнікоў БСГ Жылуновіча. У сваім артыкуле «Работнікі — беларусы ў Петраградзе» (карэспандэнцыя змешчана ў газеце № 15 «Вольная Беларусь» ад 23 жніўня 1917 года) ён піша: «О, яны (т. зн. рабочыя — **В. Ш.**) ведаюць, як соладка жыцьцё ўціснутых, не дзяржаўных нацый. Ведаюць яны, што і родная краіна іх, Беларусь, стогне ад здзеку і знявагі, але не звяртаецца іх думка, свядома і няўмыслена прыдушана пачуццё роднай старонкі. Їм убіта ў галовы сухая аднабокая думка аб агульна-работніцкім інтарэсе і ўбіта тым, каго не абходзіць справа ўціску нацый, каму не знаёма тая падвойная сіла прыгнёцення, якая цісне беларуса, як работніка наогул і беларуса ў асобку.

Мне даводзіцца быць у гуртках, суполках, хаўрусах—і ўсюды я спатыкаю шмат рабочых беларусоў то з Віленшчыны, то з Менщчыны, то Віцебшчыны і Магілеўшчыны

(Працяг на 3 стар.).

Працяг даклада тав. ШАРАНГОВІЧА

шчыны. Я пазнаю іх па першаму слову і пытаюся: беларус? — і атрымліваю адказ: «так, беларус». Я пачынаю гаварыць роднай мовай і бачу, як добра яны разумеюць яе і з адзіваным цікам слухаюць яны даўно нячутную гутарку. Я размаўляю далей і пытаю: «ці ведама ім, што робіцца ў родным краі, ці спагадаюць яны адраджэнню свайго народу, а калі спагадаюць, дык ці гатовы прычыніцца да вялікай справы вызвалення пакрыўджанай сваёй маціры — Беларусі»? Але махаюць рукамі, адварачваюць галовы, даводзячы пра марнасць і непатрэбу роднае справы. Чаму?

«О, пакрыўленыя, пакручаныя душы. І сярдую я на вас і шкадую вас: не веладае, што робіце. Таварышы мае, сыны краю роднага. Брыдка вам, пазнаўшы праўду людзкога самаўсведамлення, чураецца та го, што ёсць гістарычнай патрэбай, паступовай няўхільнасцю ў ланцугу вашых змаганняў. Памысліце».

Гэта разважанне Жылуновіча палкам і поўнасцю буржуазна-нацыяналістычнае; яно палкам і поўнасцю ў духу разважанняў украінскага нацыяналіста Юркевіча, якога ў свой час бязлітасна выкрыў В. І. Ленін у «Крытычных заметках па нацыянальнаму пытанню». Владзімір Ільіч пісаў:

«Нарэшце ў надзвычай багатым нацыяналістычнымі перлами разважанні п Юркевіча трэба адзначыць яшчэ наступнае. Меншасць украінскіх рабочых нацыянальна свядома, — гаворыць ён, — «большасць знаходзіцца яшчэ пад уплывам рускай культуры (більшість перабуває ще під впливом російскої культури)».

Калі гутарка ідзе аб пролетарыяце, гэта процістаўленне украінскай культуры ў цалым вялікарускай культуры таксама ў цалым азначае самае бессарамлівае адрадніцтва інтарэсаў пролетарыята ў карысць буржуазнага нацыяналізма» (Ленін)

Вось гэтым бессарамлівым адрадніцтвам рабочага класа займаліся Жылуновічы і їм падобныя.

Я думаю, што карэспандэнцыя Жылуновіча гаворыць таксама і аб тым, які ўплыў мела тады БСГ на рабочыя масы. Ён раўняўся нулю. Рабочыя — беларусы Ленінграда давалі прадстаўнікам БСГ правільны інтэрнацыянальны адказ. Яны гаварылі — для нас важна, каб рабочы клас трымаў уладу ў сваіх руках, для нас важна, каб рабочыя, захваціўшы гэту ўладу, адстойвалі яе. Для нас няважна, хто яны з'яўляюцца па нацыянальнасці — беларусы, украінцы, або рускія рабочыя. І вось гэта прымушала Жылуновіча і яму падобных аплакваць «пакрыўджаную сваю маці». А гэта гаворыць, што гэтыя людзі, людзі тыпа Жылуновіча фактычна процістаўлялі рабочых і прапоўных адной нацыі — другой і фактычна стаялі на пазіцыях буржуазнага нацыяналізма, дапамагалі буржуазіі ў яе барацьбе супроць пролетарыята.

Я думаю, не будзе лішнім напомніць і яшчэ адно выказванне В. І. Леніна па пэраду процістаўлення украінскімі нацыяналістамі украінскай і рускай культур. І гэта ўказанне Леніна мае непасрэдныя адносіны і да пытання аб беларускай культуры.

«Калі большасць украінскіх рабочых знаходзіцца пад уплывам вялікарускай культуры, то мы ведаем цвёрда, што побач з ідэямі вялікарускай папоўскай і буржуазнай культуры дзейнічаюць тут і ідэі вялікарускай дэмакратыі і соцыял-дэмакратыі. Змагаючыся з першага роду «культурай», украінскі марксіст заўсёды вылавіць другую культуру і скажа сваім рабочым: «усякую магчымасць абмяркоўвання з вялікарускім свядомым рабочым, з яго літаратурай, з яго колам ідэй абавязкова ўсімі сіламі лавіць, выкарыстаць, замацоўваць, — гэтага патрабуюць карэнныя інтарэсы і украінскага і вялікарускага рабочага руху» («Крытычныя заметкі па нацыянальнаму пытанню»).

Таварышы, БСГ зразумела буржуазна-дэмакратычную лютаўскую рэволюцыю, як рэволюцыю для стварэння сваёй нацыянальнай дзяржавы. Яны далей не ішлі і не маглі ісці, яны не прымалі перыяда ад Лютаўскай да Акцябрскай рэволюцыі, як этап перарастання буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі ў рэволюцыю пролетарскую. Яны змагаліся ў лагеры буржуазіі супроць перарастання буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі ў рэволюцыю соцыялістычную. Яны змагаліся супроць большэвіцкага кіраўніцтва рэволюцыяй.

Не менш контррэволюцыйную і шкодную работу ў гэты час праводзіў і Бунд. Бундаўцы вызначаліся сваёй актыўнай работай па зрыву забастовак. Яны падтрымлівалі часовы ўрад усімі мерамі, у тым ліку і сваёй пазіцыяй за прадаўжэнне імперыялістычнай вайны. Бундаўска-меншавіцкія профсаюзы не раз зрывалі рабочыя забастоўкі. Так, былі сарваны забастоўкі металістаў у Віцебску, пасля чаго металісты выкінулі з праўлення профсаюзу бундаўцаў і меншавікоў і выбралі большэвікоў. Стачка друкароў у Менску была сарвана, бо «нельга, каб усё насельніцтва не мела газет з-за забастоўкі». Бундаўцы актыўна падтрымлівалі «учредительное собрание», выказваліся за прадаўжэнне вайны і актыўнае яе падтрымванне.

У той перыяд, калі рабочы клас змагаўся за соцыяльную рэволюцыю, калі большэвіцкія газеты, заклікалі рабочых і сялян узбройвацца для барацьбы супроць панавання буржуазіі, у гэты час бундаўская газета «Векер» у перадавым артыкуле «Наш шлях» (№ 118 за 1917 год) пісала: «Калі мы хочам сапраўды ўстанаўлення адзінства, дасягнення згоды, а не падзячэння большасці меншасці, тады кожны крок, які падтрымлівае большэвікоў і ўмацоўвае іх пазіцыю злачынны. Мы не можам абмяжоўвацца аднымі пратестамі, мы павінны і абавязаны аказаць супраціўленне. Гэтае супраціўленне маральна заключаецца ў тым, каб не дапамагаць ім, нічога не рабіць для іх. У органах гарадскога самакіраўніцтва за ўсіх установах, у нашых арганізацыях, у нашых газетах, друкаваных выданнях — скрозь і ўсюды мы павінны змагацца супроць захвату ўлады большэвікамі, супроць іх гвалту цэнзуры і праследвання». Мы можам адступіць перад грубай фізычнай сілай, але гэта падкрэслівае, што маральна яны адзінокі».

Аб контррэволюцыйнай ролі Бунда сведчыць таксама і паведамленне арганізатара партыйных ячэек па Беліжскому павету т. Мусаева. Ён у сваёй тэлеграме ад 9 жніўня 1918 года піша:

«Згоднікі, лідэры Бунда, арыштаваны за прызыў да паўстання супроць совецкай улады».

Можна было-б прывесці яшчэ цалы рад дакументаў, якія паказваюць аб контррэволюцыйнай дзейнасці Бунда, аб тым, што Бунд быў актыўным памочнікам контррэволюцыі. Гэтым і тлумачыцца шпаркі адыход ад Бунда тых пролетарскіх элементаў, якія раней знаходзіліся пад яго уплывам. Бундаўцы, насаджаючы ярэйскі буржуазны нацыяналізм, у той-жа час блакіраваліся з вялікадзяржаўнікамі, падтрымлівалі палітыку манархічных астаткаў, падтрымлівалі іх мары і іх барацьбу за «единую и неделимую Россию».

Контррэволюцыйныя нацдэмы на службе ў імперыялістаў

Такім чынам, зусім ясна, што дробнабуржуазныя партыі напярэдадні Акцябра ў час яго і пасля адыгрывалі ка Беларусі актыўную контррэволюцыйную ролю.

У час агалашэння совецкай улады на Беларусі БСГ, Бунд у блоку з дробнабуржуазнымі рускімі вялікадзяржаўнымі партыямі — эсэрамі і меншавікамі — стварылі так зв. «Комитет спасения Революции», як орган узброенай барацьбы супроць пролетарскай рэволюцыі. 15-17 снежня 1917 г. беларускімі нацыяналістамі пры кіруючым удзеле БСГ быў склікан у Менску т. зв. «Усебеларускі кангрэс», які, апіраючыся на актыўнае падтрыманне рускіх вялікадзяржаўнікаў, украінскіх і ярэйскіх нацыяналістаў, імкнуўся стварыць контррэволюцыйны арганізацыйны цэнтр у процівагу органам дыктатуры пролетарыята на Беларусі.

У часы нямецкай і белапольскай акупацыі прадстаўнікі БСГ уваходзілі ў склад буржуазна-памешчыцкай беларускай рады, якая ў сваёй шалёнай барацьбе супроць рабочых і працоўных сялян Беларусі ішла адзіным узброеным фронтам з нямецкай і аўстрыйскай манархіяй, польскім, французскім і англійскім імперыялізмам, рускімі белагвардзейцамі, украінскімі і ярэйскімі нацыяналістамі.

Барацьба КП(б)Б з усімі гэтымі контррэволюцыйнымі партыямі згуртавала вакол яе шырокія масы рабочых і сялян для вырашэння тых велізарнейшых задач, якія паўсталі перад нашай партыяй і краінай пасля агалашэння БСГ як самастойнай рэспублікі. Барацьба з гэтымі партыямі ў час нямецкага акупацыі згуртавала рабочых і сялян пад сцягамі нашай большэвіцкай арганізацыі, забяспечыла паспяховае правядзенне вялікай колькасці забастовак, забяспечыла арганізацыю партызанскіх атрадаў для змагання супроць нямецкіх акупантаў.

Першы перыяд развіцця і ўмацнення радоў КП(б)Б, развіцця і ўмацнення совецкай дзяржаўнасці ў Беларусі быў шчыльна звязан з барацьбой супроць нацыянал-апартунізма. Мы маем цэлы рад дакументаў, якія выразна аведчаць аб здрадніцкіх паводзінах беларускіх нацыяналістаў, аб двурушніцтве нацыянал-апартуністаў, якія — на словах агаджаліся з лініяй партыі і ЦК РКП(б), які прадстаўляў тав. Сталін, а на справе змагаліся супроць лініі партыі і, у прыватнасці, супроць аднаго з кіраўнікоў большэвіцкай арганізацыі Беларусі т. Мяснікова і інш.

Аб тым, якую здрадніцкую контррэволюцыйную ролю ў часе арганізацыі КП(б)Б адыгрывалі нацыяналістычныя элементы, сведчыць наступны дакумент: 15 студзеня 1919 года на пасяджэнні ЦБ Компартыі Беларусі пад старшынствам т. Мяснікова заслухоўвалася пытанне аб беларускай секцыі. Вось вытрымка з пратакола пасяджэння:

«Таварыш Мяснікоў прапануе, з прычыны замечанай агітацыі некаторых беларусоў-комуністаў супроць ВКП(б), прыняць наступныя палажэнні:

1) з прычыны існавання комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі, лічыць ліквідаванымі ўсе раней дзейнічаючыя беларускія секцыі партыі ў межах Беларускай Рэспублікі. Усе да гэтага часу выданыя гэтымі секцыямі партыйныя членскія білеты гэтым самым канчаткова губляюць сваю сілу;

2) у некаторых пунктах Беларусі з'явіліся і з'яўляюцца асобы, якія называюць сабе беларускімі комуністамі, якія, як відаць, паставілі сабе мэтаю дэзарганізаваць комуністычную і совецкую работу на мясцах. Гэтыя асобы ў большасці выпадкаў вядуць нацыяналістычную прапаганду.

ЦБ Комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі гэтым заўважае, што вышэйназваныя элементы нічога агульнага не маюць з Комуністычнай партыяй. На мясцах таварышы і арганізацыі павінны лічыцца толькі з агентамі і прадстаўнікамі **Цэнтральнага Бюро Комуністычнай партыі** (большэвікоў) **Беларусі**, ці з мясцовымі камітэтамі **Комуністычнай партыі** (большэвікоў) **Беларусі**. Прапанова прымаецца. Старшыня **Мяснікоў**, сакратар **Кнорын**».

Я гэтыя дакументы прыводжу для таго, каб паказаць, што ўжо на першых этапах існавання БССР КП(б)Б правяла рашучую барацьбу з нацыяналістамі і нацыянал-апартуністычнымі элементамі. У барацьбе супроць беларускіх нацыяналістаў і рускіх вялікадзяржаўнікаў выключную гістарычную ролю адыграў т. Сталін, які вучыў большэвікоў Беларусі ленінскай непрымірымасці да малейшых праяўленняў нацыяналізма і да рознага роду ўхілаў ад лініі партыі, вучыў большэвікай прынцыповасці.

Аб перыядзе белапольскай акупацыі я не буду гаварыць таму, што гэты перыяд больш падрабязна асветлен у нашай літаратуры.

Гэты перыяд звязан з далейшым этапам нашага развіцця, звязан з далейшай нашай барацьбой супроць памешчыкаў і капіталістаў.

Час, калі БССР аказалася акупаванай на некаторы час польскімі панамі, быў часам небывалых бед, небывалага прыгнечання, небывалага тэрору супроць прапоўных Беларусі. Тыя адзекі і тэрор, пад якімі знаходзіліся беларускія працоўныя масы ў час акупацыі, яшчэ ў большай ступені штурхалі масы працоўных пад сцягі нашых падпольных арганізацый, якія кіраваліся ЦК Літбел. У гэты час наша партыя накіравала ўсю сваю ўвагу на арганізацыю рэволюцыйнага руху ў гарадах Беларусі, на арганізацыю партызанскага руху, і, у час наступу нашай Чырвонай арміі на Заходнім фронце, агульнымі сіламі: працоўных усяго СССР, Чырвонай арміі, рабочых і чырвоных партызан Беларусі, Беларусь канчаткова была вызвалена з-пад улады белапольскіх акупантаў, пачаўшы новы перыяд сваёй гісторыі, перыяд соцыялістычнага будаўніцтва.

Трэба сказаць, што ў час акупацыі як нямецкай, так і белапольскай, як ніколі, была выкрыта здрадніцкая роля прадстаўнікоў і паслядоўцаў Беларускай Соцыялістычнай Грамады, усіх і ўсялякіх дроб набуржуазных нацыяналістычных партый, нацдэмаў усіх масцей. Даволі ўспомніць хоць-бы ролю праславутага «народнага сакратарыята Беларусі», гэтага контррэволюцыйнага ўрада, які быў створан пасля адыходу совецкай улады з Менска з прадстаўнікоў БСГ, эсэраў, поалей-цыён і інш. дробнабуржуазных, нацыяналістычных партый. Вось букет «беларускіх дзеячэй», густасовых нацдэмаў, якія ўваходзілі ў склад гэтага, з дазволу сказаць, «урада»: І. Н. Макрэў, І. Я. Варонка, А. А. Смоліч, Е. В. Белевіч, І. Н. Серада, В. С. Рэдзька, Г. Н. Гелкінд, П. А. Бядунова, І. В. Злобін, А. К. Карач, П. А. Крычэўскі, Л. І. Заяц, К. Б. Езавітаў. Гэты зброд, сярод якога значная частка памешчыкаў, накіраваў нямецкаму кайзеру Вільгельму тэлеграму наступнага зместу:

«Рада Беларускай Народнай Рэспублікі як выбарная прадстаўніца беларускага народа, звяртаецца да вашай імператарскай вялікасці са словамі глыбачайшай падзякі за аслабанненне Беларусі нямецкімі войскамі, з цяжкага ўціску чужога пануючага здзеку і анархіі. Рада Беларускай Народнай Рэспублікі дэкляравала незалежнасць цэльнай і недзялімай Беларусі і просіць вашу імператарскую вялікасць аб абароне ў яе кіраванних для ўмацавання дзяржаўнай незалежнасці і недзялімасці краю і звязі з германскай імперыяй. Толькі пад абаронай германскай імперыі бачыць край добрую волю ў будучыне. Прэзідэнт Рады: Іван Серада, прэзідэнт сакратарыята Язэп Варонка. Сябры рады: Раман фон-Скірмунт, Антон Аўсянік, Паўлюк Алексюк, Пятро Крычэўскі, Язэп Лёсік».

Вядомая ўсім тэлеграма Вільгельму з просьбай прыняць Беларусь пад сваю высокую «руку» гэта таксама не адзіны і не апошні дакумент прадажніцтва і здрады.

Вось яшчэ надзвычай выразны дакумент, які адрасаван беларускім нацыянальным камісарыятам у Алэсе (13 студзеня 1919 г.) «Галоўкамандуючаму Саюзнымі Арміямі на поўдні Расіі генералу БАРТАЛЕ»:

«Генерал, я вітаю вас ад імя нацыянальнага цэнтра Беларусі, як галоўнакамандуючага галоўнымі саюзнымі сіламі на поўдні Расіі, якія прыносяць нам не толькі надзею, але, як я сказаў, пэўнасць хуткага вызвалення ад гвалта большэвікоў».

Так піша віцэ-старшыня нацыянальнага беларускага цэнтра С. Некрашэвіч.

Аб чым-жа канкрэтна просіць гэты ал'яўлены контррэволюцыянер, нацдэм Некрашэвіч у галоўнакамандуючага саюзнымі арміямі генерала Бартале? А вось яго канкрэтныя просьбы:

«1) Ваша дапамога, перад тым, як абыйсці магчымыя перашкоды, пры фармiраванні ў Алэсе беларускай арміі (Заходняй);

2) безадкладны аванс неабходных сродкаў на фарміраванне Заходняй арміі згодна каштарысаў, якія вам будуць прадстаўлены;

3 аброя і неабходныя матэрыялы для Заходняй арміі;

4) арганізацыя транспарта гэтых войск на Беларусь, дзе 40 тысяч чалавек будуць гатовы стаць у яе рады;

5) дапамога Францыі ў тым, каб Польшча дазволіла нашым войскам арганізаваць на польскай тэрыторыі базу;

6) рэальная дапамога французскіх войск, якія ў невялікім ліку павінны быць размешчаны ў нашай арміі, каб паказаць беларускаму народу сілу нашага аб'яднання. За старшыню нацыянальнага беларускага цэнтра віцэ-старшыня С. Некрашэвіч».

Не лішнім будзе спыніцца і на той ролі, якую адыгрывалі беларускія міністры і праславуты генерал Балаховіч у барацьбе супроць большэвікоў, у барацьбе за ўстанаўленне шчыльнай непарыўнай сувязі з Польшчай і Пілсудскім. Вось што паказвае Б. Савінкоў перад Вярхоўным судом.

«Быў у мяне з ім (з Балаховічам) выпадак у Мазыры.

Прыехалі з Вінніцы беларускія міністры ў Мазыр, — чорт іх ведае, якія міністры. На падводах прыехалі нейкія міласцівыя паны і заявілі, што яны міністры, што яны прадстаўляюць беларускі народ. Грошай, зразумела, папрасілі неадкладна. Ну, добра, якая мне да іх справа? Аднак, аказалася, што была справа і вось якая. Балаховіч на наступны дзень кажа мне: «ведаеце, беларускі народ прапануе мне, Балаховічу, стаць начальнікам дзяржавы беларускай».

Гэта—у Мазыры, а беларускі народ прадстаўляўся гэтымі міласцівымі панамі, якія, як я гавару, грошай папрасілі, да, прыбаўлю, і яшчэ п'янымі ў дрыг напіліся, вось—міністры».

Гэтыя дакументы можна было-б папоўніць прывітаннем беларускімі нацыяналдэмакратамі «Начальніка польскай дзяржавы Язэпа Пілсудскага» на яго «роднай зямельцы—Беларусі». Да гэтых дакументаў можна было-б дадаць надзвычай яркія па сваёй пошласці і подласці дакументы з перапіскі «шэфа вайсковага — дыпламатычнай місіі рады БНР у Латвіі і Эстыі» палкоўніка Езавітава з Балаховічам. Гуртам і ў розніцу прадавалася Беларусь, прадаваўся беларускі народ гэтымі гандлярамі, контррэволюцыянерамі, гэтымі саюзнікамі міжнародных інтэрвентаў, барацьбітамі супроць «гвалтаў большэвікоў».

Яны ўсё рабілі для таго, каб толькі арганізаваць контррэволюцыйны паход інтэрвентаў супроць совецкай улады.

І гэты іх контррэволюцыйны твар не раз з'яўляўся на паверхні нашай рэчаіснасці ў выглядзе контррэволюцыйных арганізацый, якія былі ўскрыты на апошніх этапах соцыялістычнага будаўніцтва.

***

У часе пераходу ад аднаўленчага да рэканструктыўнага перыяда была выкрыта контррэволюцыйная арганізацыя ў БССР, якая ўзначальвалася ўсё тымі-ж бізнэраўцамі—Цвікевічам, Ластоўскім, Некрашэвічам і інш., якія арганізоўвалі супроць нас, супроць соцыялістычнага будаўніцтва контррэволюцыйныя сілы, рыхтавалі сустрэчу імперыялістычным інтэрвентам. Гэтыя контррэволюцыянеры дастаткова выкрылі сябе перад рабочымі і сялянамі Беларусі, але тут важна падкрэсліць, што іх крывавы шлях вядзе ад «Беларускай соцыялістычнай грамады» і інш. дробнабуржуазных партый, якія разам з бандамі Булак-Балаховіча, Савінкава вялі барацьбу супроць нас. Аб гэтым мы ні ў якім разе не можам забываць, калі гаворым аб іхнай дзейнасці на сучасным этапе. Трэба памятаць, што нацыяналістычныя элементы, іх астаткі заграніцай і ўнутры краіны, асабліва на сучасным этапе, у звязку з падрыхтоўкай інтэрвенцыі супроць нас арганізуюцца, уступаюць у сувязь з фашызмам, для чаго, арганізуюць супроць нас асколкі кулацтва і антысовецкія элементы, каб рассыпіць пладдарм для інтэрвентаў, каб падрыхтаваць імперыялістам захват і здарванне БССР ад Совецкага Саюза.

Актывізацыя контр-рэволюцыйных нацдэмаўскіх элементаў знаходзіцца ў прамой сувязі з прыходам да ўлады ў Германіі фашысцкага ўрада—Гітлера, у сувязі з праектам Розенберга аб экспансіі на ўсход (праект захопа Украіны і Беларусі), у сувязі з антысовецкімі правакацыямі на Далёкім Усходзе і т. д.

Чыстка радоў КП(б)Б рашуча ўдарыла па нацыянал-апартуністах, якія з'яўляліся агентурай контррэволюцыйнага нацыянал-дэмакратызма ўнутры нашай партыі. Выкрыты і выкінуты з радоў партыі рад нацапартуністаў, якія па сутнасці справы былі прамымі агентамі нацдэмаў (Бондар, Капаевіч, Акуліч, Чарняўскі і інш.), якія актыўна дапамагалі контррэволюцыйнаму нацыянал-дэмакратызму ў яго падрыўной рабоце супроць партыі і совецкай улады, дапамагалі ў барацьбе за адрыў БССР ад Совецкага Саюза.

Рабочы клас і працоўнае сялянства БССР добра ведаюць, што нясе за сабою дастаўрацыя капіталістычнага ладу. Яна нясе беспрацоўе, голад і галечу, нацыянальнае і соцыяльнае прыгнечанне, цемру і рабства.

Наша партыя заўсёды вяла, вядзе і будзе весці рашучую барацьбу супроць усяляякай спробы контррэволюцыйных элементаў ператварыць БССР у калонію замежнага капітала, супроць усялякіх рестаўратарскіх спроб зноў узваліць на спіну працоўных Совецкай Беларусі ярмо памешчыкаў і капіталістаў, супроць усялякіх спроб адарваць БССР ад вялікага Совецкага Саюза.

Вось чаму апошні Пленум ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове па нацпытанню даў наступную ўстаноўку:

«Вялікадзяржаўны рускі шавінізм з'яўляецца галоўнай небяспекай у машта бе ўсяго Совецкага Саюза і ўсёй ВКП(б), але гэта ні ў якай меры не супярэчыць таму, што ў даны момант у Беларусі галоўную небяспеку прадстаўляе мясцовы беларускі нацыяналізм, які змыкаецца з імперыялістычнымі інтэрвентамі. Неабходна асабліва мець на ўвазе новую тактыку рускіх вялікадзяржаўных шавіністаў і беларускіх нацыяналістаў, падтрымліваемых усёй контррэволюцыяй, у тым ліку і трацкістамі, якія на цяперашнім этапе блакуюцца памiж сабою на агульнай платформе адрыва БССР ад СССР для паслаблення пазіцый СССР і ўмацавання пазіцый капіталізма».

КП(б)Б з часу свайго першага з'езда загартавалася, і прайшла вялікую школу Леніна-Сталіна. Яна прайшла суровую школу нямецкага падполля, польскага падполля, яна прайшла вялікую школу эпохі соцыялістычнага будаўніцтва.

КП(б)Б упаследавала ленінскія большэвіцкія прынцыпы, вырасла і ўмацавалася ў барацьбе за ажыццяўленне гэтых ленінскіх большэвіцкіх прынцыпаў.

Такія вядомыя большэвікі, як Мяснікоў, Я. М. Свярдлоў, Позерн, Любімаў, Фрунзе, Кнорын і рад іншых адыгралі выключную ролю ў справе стварэння КП(б)Б. Яны адыгралі выключную ролю і ў справе стварэння БССР.

У КП(б)Б у свой час былі прыняты асобныя выхадцы з Бунда, і інш. партый, якіх яна на падставе ажыццяўлення ленінскіх большэвіцкіх прынцыпаў здоле ла перавыхаваць. Адначасова КП(б)Б бязлітасна выкрывала і выкідвала з сваіх радоў на ўсіх этапах нацыянал-апартуністаў, якія выступалі супроць партыі, з антыпартыйнымі, контррэволюцыйнымі нацыяналістычнымі ўстаноўкамі, як з бундаўскага лагера, так і з лагера іншых дробна-буржуазных партый.

Я прывяду пару вытрымак з дакумента, які адносіцца да пачатку 1921 г. Гэта ліст групы 32 «беларусаў-комуністаў» у ЦБ Комуністычнай партыі Беларусі. У сваім лісце гэтыя «комуністы» паклёпнічаюць на цэлы этап гісторыі КП(б)Б, бесаромна паклёпнічаюць на партыю, на большэвізм. Яны пішуць: «Зварочваючыся да мінулай совецкай работы ў Беларусі, трэба канстатаваць, што незнаёмства з мінулым края, неразуменне беларускага руху, поўнае раз'яднанне з працоўнымі масамі края, адсутнасць шырокай сур'ёзнай партыйнай работы, таксы асаблівасці мінулай палітыкі, пачынаючы з 1917 г. Адсюль антыбеларуская палітыка і цэлы рад памылак у Беларусі».

Вы бачыце, у чым яны, гэтыя «комуністы», абвінавачвалі нашу партыю—кіраўніка і арганізатара Акцябрскай рэволюцыі, партыю, якая кіравала барацьбой беларускіх рабочых і сялян супроць адвечных эксплаататараў, памешчыкаў і капіталістаў. Яны абвінавачваюць нашу партыю, партыю Леніна-Сталіна, якая змагалася і змагаецца за сусветную пролетарскую рэволюцыю пад разгорнутым сцягам пролетарскага інтэрнацыяналізма, — у тым, што яна быццам бы вядзе антыбеларускую палітыку. Гэтыя водпрыскі буржуазнага нацыяналізма нашу барацьбу супроць беларускага буржуазнага нацыяналізма выдавалі за «антыбеларускую палітыку», яны паклёпнічалі на партыю, што яна «не разумее беларускага руху», прадстаўнікамі якога яны з'яўляюцца.

Так, яны былі прадстаўнікамі беларускага буржуазнага руху, сутнасць якога наша партыя, выхаваная Леніным-Сталіным, добра ведала і змагалася супроць яго і ў далейшым будзе бязлітасна змагацца. Яны паклёпнічалі на партыю, што яна раз'яднана з працоўнымі масамі і тым самым імкнуліся пасеяць у працоўных масах недавер'е да нашай партыі.

Але-ж гэта не ўсё. У гэтым сваім пасковілі «беларусы-комуністы», класавы твар якіх ужо можна бачыць з пададзенай вытрымкі, паклёпнічалі і на беларускія сялянскія масы, гаворачы, што «настрой сялянства, якое радасна сустрэла Чырвоную армію ў 1920 г., змяніўся ў апошніх часы не на карысць Совецкай улады». Іх паклёпніцтва не мела граніц. Яны абвінавачвалі і совецкую ўладу ў русіфікацыі Беларусі, паўтараючы тым самым хлусню буржуазных нацыяналістаў.

Паклёпнічаючы на партыю, яны ў той жа час высоўвалі рад буржуазна-нацыяналістычных патрабаванняў, як напрыклад: пашырэнне граніц БССР на Усход, за лік зямель Смаленскай губерні. Яны патрабавалі далучыць да Беларусі такія паветы, як Красненскі і Парэчкі і інш. Яны патрабавалі, каб наша партыя перадала-б у іх рукі і перадаверыла ім справу агітацыі і прапаганды сярод беларускіх рабочых і сялян і т. д.

Няма чаго гаварыць, што ўсе гэтыя патрабаванні нічога агульнага з комуністычнымі, большэвіцкімі прынцыпамі не мелі.

КП(б)Б, і ў далейшым выкрываючы нацдэмаў, на ўсіх этапах сваёй гісторыі бязлітасна выкрывала і іх агентуру ўнутры КП(б)Б. Асабліва гэта адносіцца да перыяда 1929-1930 г. г., калі КП(б)Б выкрыла Ігнатоўскага, Прышчэпава, А. Адамовіча, Балёцкага і інш., выкрыла арганізацыю пад назвай СВБ. Гэтыя людзі, як зараз вядома, былі не толькі нацыянал-дэмакратычнай агентурай унутры КП(б)Б, але былі прамымі контррэволюцыянерамі, прамымі агентамі контр-разведак некаторых суседніх дзяржаў. КП(б)Б выкрыла рад памылак і асобных тавараў шоў, членаў нашай партыі, памылак нацыянал-апартуністычнага характара. Усё гэта спрыяла павышэнню боездольнасці КП(б)Б, яе маналітнасці ў барацьбе за генеральную лінію партыі, супроць апартунізмаў усіх колераў, супроць трацкізма, супроць правага апартунізма, гэтай галоўнай небяспекі на сучасным этапе. А гэта яшчэ больш згуртавала вакол КП(б)Б рабочых і сялян для барацьбы за соцыялістычнае будаўніцтва.

КП(б)Б за ўмовах складанага нацыянальнага перапляцёта, атрымаўшы ў спадчыну разбураную гаспадарку, вядучы жорсткую барацьбу супроць бандытызма, нацдэмаўшчыны і т. д., кіруючы пагранічнай рэспублікай, рэспублікай, якая з'яўляецца фарпостам Совецкага Саюза на рубяжы з капіталістычным светам, арганізоўвала рабочыя і сялянскія масы, вяла іх і вядзе ад перамогі да перамогі.

Уперад, да новых перамог!

Таварышы, юбілей КП(б)Б мы святкуем у такіх умовах, калі наша партыя пад кіраўніцтвам свайго правадыра т. **Сталіна** заваёўвае буйнейшыя перамогі ў справе будаўніцтва соцыялізма. У выніку гераічнай барацьбы рабочага класа ўжо за гады першай пяцігодкі пабудаван фундамент соцыялістычнай эканомікі, разгромлен апошні капіталістычны клас—кулацтва, а калгаснікі зрабіліся моцнай апорай совецкай улады на вёсцы. **Совецкі Саюз канчаткова замацаваўся на соцыялістычным шляху.** Мы пабудавалі тысячы буйных перадавых прадпрыемстваў, якія пераводзяць усю народную гаспадарку на высокую ступень новай тэхнічнай культуры і знаходзяцца на ўзроўні лепшых узораў капіталістычнай тэхнікі. Перамогі ў развіцці прамысловасці абумовілі гіганцкія поспехі ў пераводзе сельскай гаспадаркі на рэйкі машыннай тэхнікі. **Краіна Совецкаў зрабілася краінай самага буйнага ў свеце соцыялістычнага землярэбства.**

Рабочы і ўчарашні аднаасобнік—сёнешні калгаснік, атрымалі ўпэўненасць у заўтрашнім дні, атрымалі ўпэўненасць у тым, што толькі ад якасці і колькасці затрачанай імі працы залежыць усё большае павышэнне матэрыяльнага і культурнага ўзроўню іх жыцця. Упэўнена і радасна глядзіць кожны рабочы і калгаснік на сваю будучыню. Знікла пагроза беспрацоўя, галечы, голаду, павысіліся ў рабочых патрабаванні да ведаў і культуры.

У выніку першай пяцігодкі СССР зрабіўся краінай перадавой культуры. Краіна Совецкаў ператвараецца ў краіну суцэльнай пісьменнасці. Асабліва значны гаспадарчы і культурны ўзрост мае месца ў нацыянальных раёнах Саюза, якія шпаркаідуць па шляху канчатковай ліквідацыі свайго адставання.

Таварышы, у дзень святкавання 10-й гадавіны БССР, вітаючы працоўных Совецкай Беларусі, ЦК ВКП(б) усклаў на нас, на нашу партыйную арганізацыю рад адказных абавязкаў. У гэтым прывітанні ЦК ВКП(б) паставіў перад нашым ЦК наступныя канкрэтныя задачы:

«ЦК ВКП(б) выражае ўпэўненасць, што ў новым дзесяцігоддзі рабочыя і сяляне Беларусі, пад кіраўніцтвам компартыі, развіваючы яшчэ больш рашучы наступ на капіталістычныя элементы, дружнымі намаганнямі дабіцца яшчэ больш вялікіх поспехаў у справе гаспадарчага і культурнага ўздыму краіны, у галіне ўмацавання і развіцця асноў соцыялізма ў горадзе і на вёсцы. ЦК ВКП(б) не сумняваецца, што компартыя (большэвікоў) Беларусі, пролетарыят і вясковая беднота Совецкай Беларусі ў саюзе з сярэднім сялянствам будуць упэўнена і цвёрда ісці пад ленінскім сцягам, з напружаннем усіх сіл перамагаць труднасці соцыялістычнага будаўніцтва ў адсталай БССР, не дапускаючы ў сваіх радах хістанняў і сумненняў, і даючы рашучы адпор усім і ўсякім ворагам соцыялістычнага будаўніцтва.

На абавязку працоўных БССР, якія знаходзяцца на рубяжы Совецкага Саюза з капіталістычным светам, ляжыць задача асабліва пільна сачыць за спробамі імперыялістаў пачаць новы нападзе на нашу краіну—задача мацаваць яе абароназдольнасць

(Працяг на 4 стар).

Вышэй класавую пільнасць

Гэта абавязвае ўсіх нас, святкуючы 15-ю гадавіну БССР, усіх нас, спраўляючых 15-гадовы юбілей КП(б)Б, каб мы ні ў якім разе не знізілі сваю класавую, партыйную, рэволюцыйную пільнасць.

Да гэтага нас абавязвае яшчэ і той факт, што мы ў апошні час выкрылі новую контррэволюцыйную арганізацыю з выхадцаў з той-жа самай «Беларускай соцыялістычнай грамады» і інш. дробнабуржуазных партый, што мы выкрылі контррэволюцыйную арганізацыю, якая вяла падрыўную работу супроць нас, члены якой былі перакінуты польскім фашызмам на тэрыторыю БССР для падрыхтоўкі інтэрвенцыі, для арганізацыі антысовецкіх контррэволюцыйных сіл унутры БССР.

У апошні час гэтай контррэволюцыйнай арганізацыяй кіраваў так званы Беларускі Нацыянальны Цэнтр (БНЦ), ядром якой былі перакінутыя з замежнай контррэвэдкай пад выглядам праследаемых рэволюцыйных дзеячоў такія лю дзі, як Рак-Міхайлоўскі, Валошын, Капуцкі, Мятла, Гаўрылюк, Дварчанін і інш. Гэтыя «дзеячы» яшчэ раней прымалі ўдзел ў якасці правакатараў у нацыянальна-рэволюцыйным руху ў Заходняй Беларусі. З мэтай правакацыі, шпіянажа і шкодніцтва яны былі перакінуты ў БССР, дзе да самага апошняга часу актыўна выконвалі ролю, ускладзеную на іх замежнай контр-разведкай. Контр-рэволюцыянеры з БНЦ аб'ядналіся з такімі мацёрымі нацыянал-фашыстамі, правакатарамі і шпіёнамі заграніцай, як Луцкевіч, Астроўскі і інш.—у Польшчы, Езавітаў, Пітулеўскі, Варонка—у Латвіі, Яканюк—у Літве.

Гэтыя шпіёны і правакатары трымалі сувязь з рускімі і украінскімі белагвардзейцамі. Яны знаходзіліся ў цеснай сувязі з кулацкімі элементамі, са шкодніцкімі элементамі БССР і праводзілі сваю контррэволюцыйную работу ў нас на грошы замежнай контр-разведкі.

Працяг даклада тав. ШАРАНГОВІЧА

часць,—крэпасць сусветнай пролетарскай рэвалюцыі».

Мы можам сёння ў свой 15-гадовы юбілей сказаць, што выконваючы гэтыя ўказанні ЦК ВКП(б), якія былі даны ў 10-ю гадавіну, выконваючы тыя задачы, якія стаялі перад усёй нашай партыяй, у тым ліку і перад парторганізацыяй Беларусі, мы прышлі да свайго 15-га з'езда і 17-га з'езда ВКП(б) з небывалымі дасягненнямі.

Па тэмпах нашага развіцця мы раслі шпарчэй, чым у сярэднім Совецкі Саюз. Гэта ёсць паказальнік таго, што наша партыя, выконваючы заветы Уладзіміра Ільіча Леніна, кіруемая тав. Сталіным, правільна праводзіла і праводзіць ленінскую нацыянальную палітыку. Мы маем вялікі размах у тэмпах рэканструкцыі прамысловасці і сельскай гаспадаркі на социялістычнай падставе. Мы маем вялікі размах у галіне развіцця культуры, нацыянальнай па форме і социялістычнай па зместу. Беларусь стала індустрыяльна-аграрнай краінай. Валавая прадукцыя прамысловасці вырасла ў параўнанні з даваенным часам у 10 раз. Асноўныя фонды прамысловасці Беларусі за першую пяцігодку выраслі ў 5 раз. Пабудаваны буйнейшыя заводы, як Гомсельмаш, шклозавод, фабрыка штучнага шоўку, «Сцяг індустрыялізацыі», імя КІМ і інш. Старыя, па сутнасці саматужныя заводы, ператвораны ў буйнейшыя прадпрыемствы (завод імя Варашылава, «Комунар»—у Менску, «Чырвоны металіст»—у Віцебску і інш.). Выраслі новыя галіны прамысловасці. На базе індустрыялізацыі змяніўся твар сельскай гаспадаркі. Калектывізацыя ахапіла 52 проц. сялянскіх гаспадарак. Колькасць саўгасаў выросла да 268. На тэрыторыі БССР ёсць 63 МТС з 1.565 трактарамі. Мы маем вялізарнае павялічэнне іншых складаных і поўскладаных с.-г. машын.

Значна ўзрасла ўраджайнасць і даходнасць калгаснікаў. Дзякуючы стварэнню капіталістычнага МТС і саўгасаў партыя дабілася сур'ёзных поспехаў у справе выканання лозунга т. Сталіна—зрабіць усе калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі. Указанні ЦК ВКП(б) на раз памылак, якія КП(б)Б дапусціла ў справе заготовак 1932 г. аб прысядзібных участках, у справе Сцепуры і іх выпраўленне, ліквідацыя шкодніцкіх арганізацый—дапамаглі рушыць наперад развіццё Беларусі па социялістычнаму шляху.

Значна палепшылася матэрыяльна-бытавое становішча рабочых і сялян БССР. На аснове гэтых поспехаў партыя дабілася і буйнейшых дасягненняў у справе культурна-нацыянальнага будаўніцтва. Значна ўзрасла сетка беларускіх і яўрэйскіх школ, якімі ахвачана 96 проц. дзяцей школьнага ўзросту. Цалкам ліквідавана непісьменнасць. Створана 27 навукова-даследчых устаноў на чале з БелАН. Па тэрыторыі БССР шырока раскінулася сетка ВНУ, ВТНУ, школ ФЗВ, якія ахапляюць звыш 50.000 чалавек, з якіх звыш 50 проц.—дзеці рабочых і сялян. Небывалае развіццё друку, кіно, радыё, літаратуры. Значна выраслі кадры інтэлігенцыі і навуковых работнікаў з асяродзішча рабочых і сялян. Навука стала дастаяннем шырокіх мас рабочых і калгаснікаў. Буйнейшых поспехаў дабілася партыя і ў справе абсолютаўвання нацыянальных меншасцей на іх роднай мове.

Нашы поспехі ў справе социялістычнага будаўніцтва ў БССР, у справе ліквідацыі эканамічнай і культурнай адсталасці працоўных мас Беларусі, даведзеных у часы панавання капіталістаў і памешчыкаў да крайнасці, яшчэ больш гігантскі выглядаюць на фоне адваротных працэсаў у другой частцы Беларусі—Усходняй Беларусі. Развал усёй гаспадаркі, дэградацыя і разарэнне працоўных сялянскіх гаспадарак, абнішчанне мільёнаў працоўных мас сялянства, беспрацоўе і голад сярод соцень тысяч рабочых і батракоў, культурны заняпад, рост непісьменнасці і цемры ў асяродзішчы працоўных, разгул фашысцкага тэрору і правакацыі па ўсёй краіне—вось тая суровая сапраўднасць, у якой знаходзяцца працоўныя масы Заходняй Беларусі. Аб гэтым гаворым не толькі мы—комуністы, аб гэтым піша і прэса на той бок мяжы—прэса, якую ні ў якім разе нельга западозрыць, у сімпатыях да кому нізма, як і да працоўных мас Заходняй Беларусі.

Гэтае параўнанне тлумачыць нам, чаму працоўныя масы Заходняй Беларусі з вялікім замілаваннем і надзеяй павярнулі свае вочы на Совецкую Социялістычную Беларусь, чаму яны бачаць сваю будучыню толькі пад сцягам совецтаў і згуртоўваюць свае баявыя калоны пад сцягам КПЗБ.

Мы дасягнулі буйных поспехаў у социялістычным будаўніцтве, дзякуючы паслядоўнаму ажыццяўленню генеральнай лініі ленінскай партыі, ажыццяўленню ленінскай нацыянальнай палітыкі. Гэтыя поспехі арабілася магчымымі дзякуючы сталай і ўсебаковай дапамозе з боку ўрала Совецкага Саюза. **Гэтых поспехаў мы дасягнулі дзякуючы таму, што справай социялістычнага будаўніцтва ў БССР кіруе наш ленінскі ЦК ВКП(б) на чале з т. Сталіным, які непасрэдна займаецца пытаннямі социялістычнага будаўніцтва ў нацыянальных рэспубліках, у тым ліку і ў БССР.**

Гігантскія поспехі, якіх дабілася наша партыя ў справе социялістычнага будаўніцтва БССР, забяспечваюць нам магчымасць вызначыць і ажыццявіць суверэнтэтарычныя задачы будучага.

Асабліва вялікія дасягненні мы адзначаем за апошнія два гады пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, на чале якога стаіць моцны большэвік т. Гікало. Мы дабіліся значнага ўмацавання КП(б)Б, яе маналітнасці і большэвізацыі. За гэтыя два гады прадаўжаючы неаслабна выконваць генеральную лінію нашай партыі, мы на радзе участкаў разгромілі класавага ворага, які нават прабраўся ў нашы рады, у нашыя ўстановы і вёў контррэвалюцыйную падрыўную работу. За гэтыя чатыры мы разгромілі рад контррэвалюцыйных нацдамаўскіх арганізацый. За гэтыя апошнія два гады мы правялі вялікую працу па перабудове нашай работы. За гэтыя два гады мы, выпраўляючы рад памылак на падставе ўказанняў ЦК ВКП(б), на падставе разгорнутай большэвіцкай самакрытыкі, разгромілі групоўшчыну, сямейнасць у нашых радах, якая адбівалася на ўсім нашым кіраўніцтве, тармазіла нашы поспехі. У гэтай нашай рабоце асабліва дапамагла праведзеная чыстка КП(б)Б.

Мы прышлі да 15-га з'езда КП(б)Б, да 15-й гадавіны з часу першага з'езда КП(б)Б, які адыграў выключную ролю ў гісторыі КП(б)Б, да 15-гадовага юбілею БССР, як ніколі згуртаванымі. Мы прышлі як моцны маналітны атрад, які пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК ВКП(б) і праводыра нашай партыі тав. Сталіна, згуртаваўшыся лішчэ больш вакол свайго ЦК і кіраўніка тав. Гікало, можа з поспехам ажыццяўляць велізарныя адказныя задачы, пастаўленыя перад намі ў тэзісах тав. Молатава, Куйбышава і Кагановіча да 17-га з'езда ВКП(б).

Таварышы, я думаю, што нам на 15 з'ездзе КП(б)Б, адзначаючы 15-ю гадавіну БССР і 15 год з дня першага з'езда КП(б)Б, трэба будзе яшчэ і яшчэ раз падкрэсліць тую велізарнейшую адказнасць, якая ўскладаецца ўсёй партыяй на нас, працуючых на мяжы, тую велізарнейшую адказнасць, якая ўскладаецца на ўсю КП(б)Б у справе ўмацнення абароназдольнасці нашай краіны.

Пры ўмове, калі мы, працуючы ў БССР—на фарпосце Совецкага Саюза, будзем больш і лепш працаваць, і так працаваць, як таго патрабуе ад нас наша партыя, мы з большымі поспехамі выканаем тыя задачы, якія стаяць перад намі.

Мы прайшлі 15-гадовы шлях развіцця большэвізма на Беларусі і можам на сваім з'ездзе сказаць, што большэвізм перамог, перамагае і таржэствуе

Мы дралися за дыктатуру пролетарыята ў БССР, за ажыццяўленне задач па ўмацненню дыктатуры пролетарыята, за правядзенне ленінскай нацыянальнай палітыкі, якая таржэствуе як ніколі. І толькі геройства, толькі самаадданасць рабочага класа і працоўнага сялянства пад кіраўніцтвам большэвікоў адстаялі заваяванні Окцябра, адстаялі і заваявалі дыктатуру пролетарыята; толькі сваім гераізмам самаадданасцю з поспехам, пераможна ідуць рабочыя і калгаснікі Беларусі па шляху социялістычнага будаўніцтва. **Толькі пры дапамозе Совецкага Саюза пад кіраўніцтвам ЦК ВКП(б) і непасрэдна праводыра нашай партыі тав. Сталіна—мы як ніколі ўмацавалі фарпост Совецкага Саюза на Захадзе—Совецкую Беларусь.**

Гэта каштавала рабочым і сялянам Беларусі ахвяр і крыві, але мы ідзем з поўнай упэўненасцю, што тая справа, за якую мы дралися, перамагла. Мы, як ніколі, упэўнены, што яшчэ больш згуртаванымі радамі будзем драцца за далейшыя поспехі, за ажыццяўленне другой пяцігодкі, асноўнай задачай якой з'яўляецца ліквідацыя капіталістычных элементаў і класаў наогул, поўнае знішчэнне прычын, якія параждаюць класавую рознь і эксплуатацыю, і перамаганне перажыткаў капіталізма ў эканоміцы і свядомасці людзей, ператварэнне ўсяго працоўнага насельніцтва краіны ў свядомых і актыўных будаўнікоў бяскласавага социялістычнага грамадства.

І мы зможам гэтыя задачы ажыццявіць толькі пры ўмове, калі яшчэ больш будзем умацоўваць маналітнасць сваіх партыйных радоў, непахіснасць і незыблемасць нашай вялікай ленінскай партыі.

Мы яшчэ з большымі поспехамі будзем ісці наперад у справе перамог социялізма, калі будзем вышэй трымаць сцяг пролетарскага інтэрнацыяналізма, калі яшчэ больш будзем умацоўваць інтэрнацыянальную сувязь паміж працоўнымі розных нацыянальнасцей, калі будзем весці рашучую барацьбу з тымі, хто хоць на хвіліну папрабуе палісунуць наш вялікі Совецкі Саюз, які пад кіраўніцтвам ленінскай партыі будзе социялістычнае грамадства.

Таварышы, мы яшчэ з большымі поспехамі будзем ісці наперад, з большай упэўненасцю будзем перамагаць, калі будзем штоўсенна ўмацоўваць нашу гераічную непераможную слаўную Чырвоную армію.

Няхай жыве магутная, маналітная, вялікая партыя Леніна!

Няхай жыве вялікі правадыр і настаўнік нашай партыі і ўсяго міжнароднага пролетарыята, наш любімы Сталін—лепшы праладжальнік справы Маркса-Энгельса-Леніна.

Няхай таржэствуе ленінская нацыянальная палітыка!

Няхай жыве наша гераічная непераможная Чырвоная армія!

Няхай жыве КП(б)Б і яе 15 з'езд!

(Бурныя воплескі, аркестр грае «Інтэрнацыянал»).

АДСТАЎКА АРАКІ

ТОКІО, 22 студзеня. (БЕЛТА).

Ваенны міністр Аракі падаў у адстаўку. Адстаўка прынята. Ваенным міністрам будзе назначан інспектар ваенных навучальных устаноў генерал Сендзюро Хаясі. Хаясі карыстаецца вялікай папулярнасцю сярод «маладых афіцэраў».

НОВЫ ЯПОНСКІ ВАЕННЫ МІНІСТР

ТОКІО, 23 студзеня. (БЕЛТА).

Начальнік кіраўніцтва ваеннымі навучальнымі ўстановамі генерал Сендзюро Хаясі сёння назначан ваенным міністрам Японіі і ўжо ўступіў у выкананне абавязкаў. Начальнікам ваенных навучальных устаноў назначан б. нам. начальніка генштаба Мадзакі. Аракі назначан членам Вышэйшага ваеннага совета, прадаўжаючы, такім чынам, займаць вілны пост у кіраўніцтве арміяй.

СЕСІЯ ЯПОНСКАГА ПАРЛАМЕНТА

ТОКІО, 23 студзеня. (БЕЛТА).

Сёння адбылася першая дзелавая пасяджэнні абодвух палат японскага парламента. З прамовамі выступілі: Саіто — аб палітыцы ўрада. Хірота — аб знешняй палітыцы і Такахасі — аб бюджэце на 1934-35 год і фінансавым становішчы

«Лічаць, што сесія пройдзе без буйных падзей. Гэтаму ў значнай ступені дапамагае адстаўка Аракі. Якая адхіляе, на думку друку, мяркуемыя запытанні пэнутатаў і выступленні па пытаннях ваеннай палітыкі.

СТАЛІЦА ФУЦЗЯНСКАГА ЎРАДА ЗАНЯТА ВОЙСКАМІ НАНКІНА

ШАНХАЙ, 22 (БЕЛТА).

Новая сталіца фуцзянскага ўрада Чжаньчжоу занята без супраціўлення нанкінскімі войскамі. Чатыры камандзіры дывізій 19-й арміі заявілі аб сваёй лаяльнасці к Нанкіну, аб разрыве з фуцзянскім урадам і аб спыненні ваенных аперацый супроць нанкінскіх войск.

ХОРНБЕК АБ СТАНОВІШЧЫ НА ДАЛЁКІМ УСХОДЗЕ

Н'Ю-ЮРК, 22 студзеня. (БЕЛТА).

Начальнік усходняга дэпартамента міністэрства замежных спраў ПАЗШ Хорнбек выступіў з прамовай аб становішчы на Далёкім Усходзе.

Ён заявіў:

«Амерыканскі народ адмоўна адносіцца да правяўшыхся ва ўсіх частках Далёкага Усхода тэндэнцый імперыялістычнай лоўлі рыбы ў мутнай вадзе. Даволі калі я звярну ўвагу на той факт, што формула не прызнання прымянялася амерыканскім урадам у радзе выпадкаў не толькі ў сувязі са становішчам на Далёкім Усходзе, але таксама ў сувязі з становішчам у лацінскай Амерыцы. Да гэтай формулы была прыцягнута ўвага ўсяго свету, калі ПАЗШ спасылаліся на яе ў ідэнтычных нотах, накіраваных Кітаю і Японіі ў сувязі са становішчам на Далёкім Усходзе».

Прыводзячы вытрымкі з абмена пісьмамі Рузвельта і Літвінава, Хорнбек заявіў, што ПАЗШ імкнуцца весці «добрасуседскую палітыку». У заключэнне Хорнбек заявіў, што выказвае свой асабісты пункт гледжання.

ГЕРМАНСКАЯ ПРЭСА АБ АДСТАЎКЕ АРАКІ

БЕРЛІН, 23 студзеня (БЕЛТА).

Германская прэса адлае вялікую ўвагу адстаўцы японскага ваеннага міністра Аракі, падкрэсліваючы, што ён з'яўляецца найбольш моцным чалавекам у Японіі. Газеты лічаць, што адстаўка гэтага найбольш папулярнага чалавека ў Японіі» тлумачыцца знешня-палітычнымі меркаваннямі.

«Дэр таг» у сувязі з адстаўкай Аракі заўважае:

«Калі ўмацаванне японскага ўплыву ў Манчжурыі вітаецца ўсімі групамі Японіі, то існуюць разыходжанні адносна прадпрымання палітыкі экспансіі, пачатай у верасні 1931 года і здольнай прывесці да міжнародных ускладненняў».

ДАЛЕЙШАЯ АКУПАЦЫЯ ПРАВІНЦЫІ ЧАХАР

ШАНХАЙ, 22 студзеня (БЕЛТА).

Кітайскія газеты ўказваюць, што становішча ва ўсходняй частцы правінцыі Чахар, паранейшаму, напружанае. Нашэракор японскім паведамленням аб адыходзе японскіх войск з раёна Лунмынсу, газета «Шуньбао» заяўляе, што японскія часці акупіравалі ўзгоркі вакол гэтага пункту.

Японскія ўлады, паранейшаму, патрабуюць эвакуацыі кітайскіх войск з раёнаў Чычэна (на паўночны захад ад Бэйпіна) і Лунмынсу, матывуючы, што прысутнасць кітайскіх войск становіць сабой «пагрозу для правінцыі Жэхе».

Такім чынам, японцы, паводле слоў кітайскіх газет, намераны расшырыць дэмілітарызаваную зону, уключыўшы ў яе ўсходнюю частку правінцыі Чахар.

Адначасова ўзмацняецца націск мангольскіх аўтанамістаў на нанкінскі ўрад. Газета «Шуньбао» паведамляе, што звыш 100 мангольскіх прадстаўнікоў у Нанкіне налажылі сход, на якім пастанавілі трэбаваць, каб нанкінскі ўрад адмяніў сваё рашэнне па пытанню аб аўтаноміі Унутранай Манголіі. У выпадку невыканання гэтага патрабавання, мангольскія дэлегаты пагрозілі вяртацца ў Манголію і атмовіцца ад сваіх мандатаў а таксама прапанаваць усім мангольскім рэпрэзентантам і студэнтам пакінуць Кітай і [illegible] барацьбу за поўную аўтаномію Унутранай Манголіі.

Прамова тав. Траяноўскага па радыё

ВАШЫНГТОН, 22 студзеня. (БЕЛТА).

Поўнамочны прадстаўнік СССР у ПАЗШ т. Траяноўскі выступіў па радыё з прамовай, якая трансліравалася на ўсёй краіне. Тав. Траяноўскі вітаў амерыканскі народ і заявіў, што ён будзе працаваць над умацаваннем доўгай дружбы паміж ПАЗШ і СССР.

«Я спадзяюся, — заявіў ён, — што абедзве краіны будуць супрацоўнічаць у інтарэсах міру. Я буду рабіць усё, што ад мяне залежыць, каб падтрымліваць сілы, дапамагаючыя ўмацаванню дружбы паміж народамі, і ўзмацняць мерапрыемствы, накіраваныя на ўмацаванне міру. Я лічу, што захаванне міру з'яўляецца зараз важнейшай задачай чалавецтва. Калі абедзве нашы краіны могуць аказаць садзейнасць вырашэнню праблемы міру, ім будзе забяспечана ўдзячнасць усіх народаў».

У ЛЕНІНСКІЯ ДНІ ЗА МЯЖОЙ

ПОЛЬШЧА

ВАРШАВА, 22 студзеня. (БЕЛТА).

Напярэдадні гадавіны смерці Леніна ў розных пунктах горада адбываліся шматлікія масоўкі і дэманстрацыі рэвалюцыйных рабочых. Паліцыя была прыведзена ў баявую гатоўнасць. На адным з буйных рабочых мітынгаў выступіў кандыдат Розенберг.

На вуліцы Окопавай пры сутычцы дэманстрантаў з паліцыяй ранены 2 паліцэйскія агенты. На вуліцы Мілай паліцэйскі патруль, які прабаваў рассеяць дэманстрацыю, быў закідан каменнем. У часе разгону мосткаў арыштавана звыш 90 чалавек.

У рабочых кварталах распаўсюджваліся лістоўкі, заклікаўшыя аб'явіць 24 студзеня палітычную забастоўку пад лозунгамі барацьбы супроць антырабочых дэкретаў і супроць паступлення капіталістаў.

ЧЭХАСЛАВАЧЧЫНА

ПРАГА. (БЕЛТА).

Чэхаславацкая компартыя адзначыла дзесятую гадавіну смерці Леніна ўрачыстымі сходамі ў рабочых клубах і выпускам спецыяльных выданняў. Сярод рабочых распаўсюджваецца вялікі плакат у фарбах з партрэтамі Леніна і Сталіна і брашура Горкага аб Леніне. Выпушчана таксама ў новым выданні брашура Леніна «Дзяржава і рэвалюцыя». Гэтымі днямі выходзіць восьмы том поўнага збору твораў Леніна на чэшскай мове.

«Руде право», «Форвертс», «Свет працаи» і ўся рэвалюцыйная рабочая прэса выпусцілі ленінскія чумары з урыўкамі з твораў Леніна. Ёсць цытат з твораў Леніна ў «Руде право» выкрэслены цэнзурай

*

ПРАГА, 21. (БЕЛТА).

«Лідове новіны» ў сувязі з дняй смерці Леніна піша. «Мінуўшыя 10 год апраўдалі лозунг — «Ленін памёр, але справа яго жыве». Совецкі баланс сведчыць аб бясспрэчных поспехах СССР. СССР становіцца краінай высокай тэхнічнай і матэрыяльнай культуры».

ШВЕЦЫЯ

СТАКГОЛЬМ, 22 студзеня. (БЕЛТА).

Компартыі Даніі, Нарвегіі і Швеціі ўчора арганізавалі рад многалюдных мітынгаў у сувязі з дзесятай гадавінай з дня смерці Леніна. У Стакгольме з дакладам аб ленінізме і барацьбе рабочага класа ў адной з буйнейшых зал горада выступіў сакратар ЦК шведскай компартыі Ліндэ Рот. У рэзалюцыі сходу высунута патрабаванне аб вызваленні Дзімітрава, Торгдера, Панова і Танева.

ПАЗШ

Н'Ю-ЮРК, 22 студзеня. (БЕЛТА).

У Н'ю-Ёрку адбыліся тры сходы памяці Леніна, у якіх прымала ўдзел 20 тыс. чалавек. Ва многіх іншых гарадах таксама адбыліся сходы.

ПЕРШАЯ Ў БССР КАТАНІННАЯ ФАБРЫКА

Усесаюзны трэст «Катанін» узлучыў у план 1934 года пабудову ў Оршы першай у БССР катанінай фабрыкі. Катанін — гэта матэрыял, які атрымліваецца ад пераапрацоўкі ільняной сыравіны і адыходаў ад шпінтурбін. Галоўны спажывец-катанінна — базавічныя фабрыкі.

Аршанская фабрыка ахопіць 25 ільназаводаў 11 раёнаў БССР. Гэтыя заводы ўжо ў бягучым годзе змогуць даць для катанінай вытворчасці 10 тон сыраду.

Фабрыка будзе двухагрэгатнага тыпу, яна дасць да 5 тыс. тон катані на ў год, пераважна для Ярцэўскай прадзільнай фабрыкі і тэкстыльных прадпрыемстваў Масквы.

Агульны кошт будаўніцтва — 5 млн. рублёў. Пуск у эксплаатацыю фабрыкі намечан у пачатку 1935 года.

БССР НА ВЫСТАЎЦЫ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ НАРОДАЎ СССР

Да ўсесаюзнага з'езда пісьменнікаў у Маскве адкрываецца вялікая выстаўка мастацкай літаратуры народаў СССР.

На выстаўцы арганізуецца беларускі аддзел, які пакажа дасягненні мастацкай совецкай літаратуры БССР за 16 год рэвалюцыі, паслярэвалюцыйны фольклор, класавую барацьбу на літаратурным фронце, барацьбу з контррэвалюцыйнай нацдэмаўшчынай.

Беларуская совецкая літаратура будзе прадстаўлена і ў аддзелах абарончай, тэхнічнай і дзіцячай літаратуры.

Выстаўка адкрыецца ў Цэнтральным парку культуры і адпачынку імя Горкага. (БЕЛТА).

УСЕБЕЛАРУСКАЯ ГЕАЛАГІЧНАЯ ВЫСТАЎКА

У Беларяржмузеі ў Менску да XV з'езда КП(б)Б адкрывася вялікая выстаўка карысных выкапняў БССР. Выстаўлена шмат цікавейшых экспанатаў. Прадстаўлены ўсе ўзоры выкапняў, іх хімічныя аналізы, геалагічная карта БССР, профіль буравых свердлін у Менску і іншых гарадах, геалагічны профіль расійскай раўніны і БССР, карта мінеральных крыніц і БССР, карта мінеральных крыніц і БССР, карта мінеральных крыніц і БССР.

Паведамленні

ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 26-27 студзеня г.г. у гор. Бабруйску будзе працаваць выязная партканісія ЦКК КП(б)Б па разгляду партспраў Бабруйскага, Глускага, Парыцкага раёнаў наступных т.т.:

БАБРУЙСК — 26-1—34 г.

Лепяновіч П. Ф., Тараканаў Е. І., Кавхуто Г. З., Пацехін Х. Н., Габрусь В. З., Крукаў Ф. І., Хацько Н. П., Шуб З. Х., Гарбачоў Г. Л., Пінчук А. С., Коўба А. П., Грязоўскі Х. Б., Пятровіч П. А., Шэхачгаўз С. З., Кантаровіч М. П., Крукоўскі В. І., Лагуна А. А., Лапухін Л. К., Варашэнкін І. А., Чэрны М. Я., Бародзіч С. В., Нісневіч Г. М., Бутвін М. П., Гелер І. Б., Батукоў. Ешчыч А. Л., Кацнельсон Н. Э., Булкіна М. Г.

ПАРЫЧЫ — 27-1—34 г.

Лапшкевіч П. Ф., Яўстратаўскі Я. Л., Матыкін М. М., Іванова А. І., Бандарэнка М. М., Кахочкін Г. П., Верас Х. М., Харонеко М. А., Верас Я. Я., Файнберг А. Е., Кучынскі П. Я., Мітрафанаў С. В.

ГЛУСК — 27-1—34 г.

Кабешэй Я. М., Акулін А. Я., Падкоўскі В. В., Сальковіч А. А., Сенкевіч М., Купцэвіч М. К., Лепін К. Л., Раговін А. Я., Левін, Кіралеўскі А. У., Вальфсон Г. Л., Бандарэнка А. Р., Юхневіч А. А.

Яўка пералічаных таварышоў абавязкова. Выклікаемыя таварышы павінны мець пры сабе вопытны ад парт'ячэек аб сваёй апошняй рабоце.

Праезд за свой кошт.

ПАРТКАЛЕГІЯ.

ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 27-28 г.г. у гор. Віцебску будзе працаваць выязная партканісія ЦКК КП(б)Б па разгляду партспраў Віцебскага, Лёзненскага, Суражскага раёнаў наступных т.т

ВІЦЕБСК — 27-1—34 г.

Пепін Н. Г., Сцефаноўскі А. І., Анікеяў Г. П., Раманенка Н. Н., Фроалоў В. С., Дрынгрожык І. І. Хомчанка Л. С., Кэршакоў З. Г., Тарабанаў П. Ф., Каулін І. А., Каўкоў А. Я., Качаргін С. С., Варцілаў К. О., Кімовіч Я. Ф., Шурыц С., Мельнікаў В. С., Краснер З. М., Сыпрыдзенка П., Верамеєва Ф. М.

СУРАЖ — 28-1—34 г.

Сапожкін В. М. Булыбенка Т. А.

ЛЁЗНА — 28-1—34 г.

Ігнацюк Л. І., Алёшкін А. Ф., Баранаўкін В. М., Дуброўскі Е. Л., Раханаў Е., Барташ Я. І., Дзяткоў П. С., Мамонава Е. Я., Пуценкоў М. К., Міронаў І. С.

Яўка пералічаных т.т. абавязкова Выклікаемыя таварышы павінны мець пры сабе вопытны ад парт'ячэек аб сваёй апошняй рабоце.

Праезд за свой кошт.

ПАРТКАЛЕГІЯ.

Паркалегія ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 26-1 у гор. Жлобіне будуць разглядацца партсправы наступных т.т.

РАГАЧОЎ — у Жлобіне 26-1

Зенькоў Д. К., Чарняк А. З., Лукяніцаў Зм. Я., Лакуценко А. Я., Карнаў С. А., Казакевіч А. С., Кулінчэўскі А. С., Багданоўскі А. М., Бізюк М. К., Архіненка С. М., Агеенка Я. Я.

ЖЛОБІН — 26-1

Міхайлаў С. М., Міхайлоўскі П. А., Барадуновіч Х. А., Савасц'янечка І. Д., Сахараў М. Т., Лінскі Я. Б., Плевако П. В., Рыбаў Д. М., Троцкі Д. С., Абраменка А. В. Шаўпоў С. С., Холаскін М. К., Чаушнік М К., Себлік Хв. Р., Барцюшкін Д. Р., Васільеў П. Ф., Злыноў (заява), Гудберг І. Д. (заява). Любчанка В. Т. (заява), Сарачынскі Р. М., Карніленка В. П., Козараў З. О., Крышнеў, Трафімаў, Н. Н., Савасц'янчык Хв. Д. (заява), Бабкоў П. С. (заява).

Яўка пералічаных таварышоў абавязкова. Выклікаемыя павінны мець пры сабе вопытны парт'ячэйкі аб апошняй сваёй рабоце.

ПАРТКАЛЕГІЯ.

ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 27-28-1—34 г. у г. Мозыры (райКК-РСІ) будзе працаваць выязная партканісія ЦКК КП(б)Б па разгляду апеляцый Мазырскага, Нараўлянскага і Ельскага раёнаў наступных т.т.:

МАЗЫР НА 27-1—34 г.

Рудніцкі А. Ф., Сямёнаў М. А., Цалуяк Я. А., Шведа Х. З., Лапушкін Т. П., Сапота Н. А., Войтаў Я. Г., Ратаевіч П. А., Шітов Ю. І., Адамушка Н. К., Бутлак Т. Р., Гнедзько Ц. Б., Кананчук А. І., Шустэрман І. М., Буракоў М. А., Малашчанка В. Р., Гул А. Е., Голубеў В. І., Есісеў І. П., Лаўда А. І., Будзённы Р. М., Малінаўскі А. Р., Міронава К. Н., Чыгінаў Ф. В., Мышкавец П. І., Рудкоўскі А. С., Рабікоўіч Я. М., Ляўковіч П. М., Юшын В. В., Абрамаў І. П., Антоненко М. Л., Грытчэнка І. С., Конаш Д.

ПА НАРАЎЛЯЧСКАМУ РАЁНУ Ў МАЗЫРЫ НА 28-І

Альхавік М. Я., Шарай Р. А., Кукуляк К. А., Іоўка К. В., Воржышак Б. Ф., Бандарэнка Я. М., Краўчанка Р. А., Бастука Ф. Р., Дзюбенка М. Я., Шыкула М. А., Хацкоў П. К., Кашалёва Ю. С., Гарбачоў С. І

ПА ЕЛЬСКАМУ РАЁНУ Ў МАЗЫРЫ НА 28-І

Белы М. К., Вахліс Д. Н., Леўчанка І. Ц., Калач А. М., Дубадзель Д. Т., Суровага Ф. А., Казіннаў В. А., Цайц Г. К., Лось В. А., Пылько А. О., Рупкі Г., Бікман І. І., Верамейка П. М., Лукшэвіч Я. Г., Ратаенка Н. К., Шаўчанка Ц. К., Ратаенка П. Н., Рапапарт А. Б., Кімбароўскі Х. В.

Яўка пералічаных т.т. абавязкова. Выклікаемыя павінны прадставіць вопытны парт'ячэек аб апошняй сваёй рабоце.

ПАРТКАЛЕГІЯ.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Першы Дзяржаўны Тэатр БССР (ЕДТ—І)
СЁННЯ 24 студзеня
Пушыны ЧОРНЫ
„БАЦЬКАЎШЧЫНА"
Пачатак у 8 гадз. вечр.

Гуканы кіно-тэатр СЫРОЗ
Двацаты гуканы мастацкі фільм
Двацаты народжаны
Дзіцячы гуканы кіно-тэатр
Дакументальны фільм АБ ЛЕНІНЕ
ВЯЛІКІ ШЛЯХ
Кіно Пятырэцкага
Мастацкі гукавы фільм
НОРД-ОСТ
Кіно ПРОЛЕТАРЫЯ
Новы мастацкі совецкі фільм
ГОРОД пад УДАРАМ
Кіно СПАРТАК
ВЫДАТНЫ ФІЛЬМ
МАШЫ І ЛЮДЗІ
драма ў 6 частках.

Ячэйка КП(б)Б, мясцком і супрацоўнікі Белбюро тэкста з глыбокім жалем паведамляюць аб заўчаснай смерці карэктара тэкста

тав. МОЎЧАНА Нікалая Александравіча,

паследняўшай 22-га студзеня. Пахаванне адбудзецца 24-га студ. ніка. Вынас цела ў 4 з пал гадз. дня з клуба ім. Сталіна.

Дом Комуністычнай Асветы імя К. Маркса

ПАВЕДАМЛЯЕ, ШТО

з 25 студзеня 1934 г., пасля 3-тыднёвага перарыву, зноў пачынае сваю працу Навуковая чытальня і бібліятэчна дом Комасветы, а таксама кансультацыя па гісторыі, рэгіяналазн.

Уваход у навуковую чытальню выключна па пропусках і па пазвусках, якія атрымліваюцца непасрэдна ў заг. Дома Комасветы.

Пры ўваходзе необходна аставляць верхнюю вопратку, шалікі і партфелі ў раздавальні.

Загадчык Дома Комасветы Ліпновіч.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ РАДЫЁПЕРАКЛІЧКА

аб выкананні пастаноў ЦК КП(б)Б ад 23-X—1933 г. па правядзенню Усебеларускага паходу

па зборы сельска-гаспадарчых вынаходстваў і рацыяналізатарскіх прапаноў,

праведзенным НКЗ БССР сумесна з Агітпрасам ЦК КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ, ЦС таварыства вынаходцаў і штабам паходу

ПЕРАНОСІЦЦА

з 18 на 26 студзеня г. г. на 12 гадз. ночы.

У пяці ночы павінны прыняць удзел усе загадчыкі райсем дзелаў, дырэктары МТС і саўгасаў, старшыні райпрофсоветаў, сакратары РК ЛКСМБ і дырэктары навукова-даследчых устаноў сістэмы НКЗБ, [illegible] калгасы павінны арганізаваць масавае радыёслуханне.

Старшыня штаба нам. Наркома Земляробства БССР СТРЭЛЕ.

Упаўнаважаны Галоўлітбела № К—2365.

Масква, друкарня «Зазды»